PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://www.kurier-poranny.com/niwa/

№ 29 (2358) Год XLVI | Беласток 22 ліпеня 2001 г. | Цана 1,50 зл.

Выбарчае лета

Яўген Мірановіч

У страшэнных канвульсіях зыходзіць салідарніцкі ўрад Ежы Бузка. Сваркам паміж партыйнымі дзеячамі і карупцыйным скандалам няма канца. Усе і ўсіх абвінавачваюць у ашуканстве, дзейнасці ў некарысць інтарэсам дзяржавы і грамадства. Спецслужбы змагаюцца з пракуратурай, міністэрства нацыянальнай абароны — таксама з гэтымі ж сакрэтнымі службамі, а чыноўнікі, якія за некалькі месяцаў патрацяць мяккія крэслы, шукаюць нішу, каб у камфартабельных умовах перачакаць кадравы землятрус. Лідэр Саюза левых дэмакратаў Лешак Мілер 6 ліпеня ў Варшаве, падчас з'езду кандыдатаў на паслоў і сенатараў ад гэтай партыі, выступаў амаль як прэм'ер-міністр. З такой пазіцыі ацэньваў сучасную сітуацыю ў Польшчы і ставіў прагноз на будучыню. Выглядае на тое, што тры месяцы да выбараў усім вядомы іх вынік. Адкрытым астаецца толькі пытанне хто з левага лагера будзе паслом, сенатарам ці міністрам. А кандыдатаў ёсць нашмат больш чым месц. Салідарнікі спрабавалі гэтую праблему вырашыць шляхам стварання ўсялякіх новых адміністрацыйных утварэнняў, разбудовай да межаў абсурду адміністрацыі. За партыйным актывам пайшлі іхныя свякі, швагры, калегі. Усё закончылася ўзнікненнем карупцыйнай сістэмы ўлады, якой сёння ніхто не ведае як пазбыцца. Найгоршае аднак тое, што бюджэт дзяржавы не вытрымаў такога шаленства. Сёння грошай няма ўжо ні на адукацыю, ні культуру, ні ахову здароўя, ні сацыяльную дапамогу найбяднейшым.

У адным з чэрвеньскіх нумароў штотыднёвіка „Не" яго рэдактар Ежы Урбан асцерагаў партыйных калег перад неабмежаванай прагнасцю, якая найчасцей спадарожнічае людзям пераможнага лагера. Урбан пераконвае, што ў найбліжэйшым часе варта быць сумленным чыноўнікам, паслом ці міністрам. Дзяржаўная маёмасць у пераважнай большасці ўжо раскрадзена („прыватызаваная"), а партыйны актыў можа яшчэ добра жыць, выконваючы ўсялякія публічныя функцыі ў дзяржаўнай або самаўрадавай адміністрацыі. Таму — раіць таварышам Урбан — варта пазбягаць усялякіх карупцыйных афёр і будаваць імідж заступнікаў простага люду, каб атрымаць ягоную падтрымку на кожных чарговых выбарах. Чатыры гады таму Ежы Урбан раіў сваім калегам зрабіць усё, каб прайграць выбары. Прапанаваў даць уладу салідарнікам, якія рваліся рабіць рэформы і пры нагодзе паставіць сваіх актывістаў на пасты, дазваляючы браць публічныя грошы і пашыраць уплывы. Невядома ці посткамуністы не пойдуць шляхам салідарнікаў, вядома толькі, што маюць шанц доўга кіраваць Польшчай.

[*працяг* ☞ **8**]

Удзельнікі III З'езда беларусаў свету ля помніка Янку Купалу.

Форум беларусаў свету

Віталь Луба

5-6 ліпеня г.г. у Мінску адбыўся III З'езд беларусаў свету, арганізаваны Міжнародным грамадскім аб'яднаннем „Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына»". Рыхтаваўся ён, у адрозненні ад папярэдніх з'ездаў, без дапамогі ўлад. Амаль да апошніх дзён з-за непаслядоўнасці сталічных улад невядомым было месца яго правядзення. Толькі 29 чэрвеня вечарам канчаткова высветлілася, што з'езд адбудзецца ў зале Дома літаратараў. А месяц раней на старонках „Голасу Радзімы" намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей Беларусі Іван Яновіч будучы з'езд назваў „статутным справаздачным мерапрыемствам гэтай грамадскай арганізацыі", якое „можа ператварыцца ў палітычнае шоу". Адзначыў ён яшчэ, што „рыхтуемы з'езд (...) выглядае як палітычная акцыя апазіцыйнага да ўладаў Беларусі характару", і арганізацыям, якія пашлюць дэлегатаў на з'езд „Бацькаўшчыны" рэкамендаваў „улічваць гэтыя абставіны".

Насуперак намаганням афіцыйных чыннікаў, якія прапанавалі перанесці з'езд на канец або на пачатак наступнага года, III З'езд беларусаў свету ўсё ж такі адбыўся. Удзельнічалі ў ім 224 дэлегаты з краін СНД, Прыбалтыкі, Заходняй Еўропы і ЗША. З Польшчы ў працах з'езда ўдзельнічалі дваццаць два дэлегаты. Беларускае грамадска-культурнае таварыства, улічыўшы афіцыйную пазіцыю ўрада, сваіх прадстаўнікоў не паслала. У ліку 149 гасцей з'езда былі, між іншым, пасол ЗША Майкл Козак, віцэ-міністр культуры Валерый Гедройц і згаданы ўжо Іван Яновіч.

У дакладах, якія былі зачытаны ў першы дзень з'езда, выказвалася занепакоенасць станам нацыянальнай свядомасці беларусаў, становішчам беларускай мовы і культуры. Балючай справай з'яўляецца таксама дэмаграфічнае становішча Рэспублікі Беларусь, якая на пачатку III тысячагоддзя апынулася на парозе духоўнага і фізічнага знішчэння. Некалькі гадоў запар на Беларусі смяротнасць перавышае нараджальнасць і ўпершыню за многія гады колькасць насельніцтва ў краіне налічвае менш за 10 мільёнаў. Вялікую трывогу выклікае таксама стагнацыя ў эканоміцы, паслядоўнасці чарнобыльскай катастрофы і нарастаючыя працэсы эміграцыі.

У дыскусіі моцна падкрэслівалася важнасць гістарычнай айчыны, яе духовага і эканамічнага стану для дыяспары. Старшыня Беларускага саюза ў Польшчы Яўген Вапа адзначыў, што без вялікай, моцнай духовай бацькаўшчыны нацыянальныя меншасці хутчэй асімілююцца, а без веры ў яе магутнасць становяцца слабейшымі. Але кіраўніцтва сённяшняй Беларусі, на што ўказвалі чарговыя прамоўцы, вядзе антынацыянальную палітыку, доказам чаму з'яўляецца нераўнапраўнае становішча мовы тытульнай нацыі і яе культуры, а таксама палітычны курс на аб'яднанне Беларусі з Расіяй. Для ажыццяўлення гэтай мэты прыцягваюцца беларускія суполкі ў Расіі. Выявілася гэта ў выступленнях маскоўскіх дэлегатаў Францішка Каўрыгі — старшыні Савета Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі „Беларусы Масквы" і Генадзя Леха — старшыні Таварыства беларускай культуры імя Францыска Скарыны. Аказваецца, што апрача 6 беларускіх суполак, якія ўзніклі ў дзевяностых гадах, апошнім часам паўсталі 42 суполкі, згуртаваныя ў федэральных аўтаноміях, якія падтрымоўваюць аб'яднанне Беларусі і Расіі. Новастворанымі арганізацыямі цікавіцца беларускае

[*працяг* ☞ **2**]

Купальская ноч у Белавежы

Сёлетняе свята прыцягнула ў Белавежу каля 7 тысяч аматараў народнага гуляння. Большасць публікі складалі маладыя людзі, якія з вянкамі на галовах, з півам у руках гулялі разам са старэйшымі ўдзельнікамі. Купалле закончылася апоўначы пусканнем вянкоў на ваду. На жаль, выплятаюць іх старэйшыя замужнія жанчыны, а не дзяўчаты.

[*народнае гулянне* ☞ **3**]

Мне падабаецца мая праца

У 1990 годзе працаваў я тры месяцы ў Варшаве, дапамагаў ствараць пасольства. Тады прыязджаў я і ў Беласток, каб паглядзець, якія тут умовы для адкрыцця консульства. Дык можна сказаць, што сярод беларускіх дыпламатаў быў я першапраходцам.

[*размова з генконсулам* ☞ **4**]

Пераможцаў не судзяць

Мілошавіч — несумненны дыктатар і злачынца, але такіх як ён у свеце нямала. Забойцаў са званнем прэзідэнтаў, прэм'ер-міністраў, міністраў можна таксама знайсці сярод харвацкіх, баснійскіх, турэцкіх, ізраільскіх, палесцінскіх палітыкаў, не ўпамінаючы албанскіх.

[*вялікая палітыка* ☞ **4**]

Выратаваць ад забыцця

У драўляным будынку колішняй Падставовай школы ў Дубічах-Царкоўных будзе працаваць Рэгіянальны музей беларускай культуры і гісторыі. Будуць у ім знаходзіцца кухня і пакой, з колішнім вясковым абсталяваннем і дзве выставачныя залы.

[*новы музей* ☞ **5**]

Калісь лепш было

Калгас спыніў дзейнасць і здавалася б, што цяпер былыя калгаснікі павінны ўзяць справу ў свае рукі. Аднак гэта справа даволі складаная, бо не могуць яны забраць сваёй зямлі, унесенай у калгас імі або іх продкамі. За выдзяленне тае калісь уласнае зямлі землямеры загнулі такую цану, што не па кішэні яна яе саўладальнікам.

[*настальгія* ☞ **9**]

Ад страху сонца не бачылі

У Курашаве, у школе і лепшых хатах, пасяліліся нямецкія гаспадары і тыя дванаццаць нашых, што асталіся, два дні рабілі немцам, а адзін сабе. Немцы старэйшыя былі, змабілізаваныя, без сем'яў. Усё, што бежанцы ў полі пакінулі, немцы скарысталі — яравое, бульбу і жывёлу.

[*успаміны* ☞ **10**]

Беларусь — беларусы

Галадоўка чачэнскіх уцекачоў

Вось ужо чатыры тыдні працягваецца галадоўка чачэнскіх бежанцаў у Інгушэціі. Удзельнікі гэтай акцыі патрабуюць спынення ваенных дзеянняў у Чачэнскай Рэспубліцы Ічкерыя і вываду расійскіх войск, а таксама пачатку перагавораў з прэзідэнтам ЧРІ Асланам Масхадавым. У знак салідарнасці з патрабаваннямі галадаючых у шасці гарадах Польшчы 10 ліпеня 2001 года пачалася галадоўка 500 уцекачоў з Чачні, якім больш за 10 гадоў.

На пытанне: „Якую Вы бачыце магчымасць заканчэння вайны?" адказваюць бежанцы, якія пражываюць у лагеры ў Беластоку.

Удзельнік 1 і 2 чачэнскай вайны, інвалід II групы, падпалкоўнік Ічкерыі Зеудзі Х.: — Адзінай неабходнай і дастатковай умовай заканчэння вайны можа быць толькі незалежнасць Ічкерыі. Расія загразла ў гэтай бруднай вайне і можа перамагчы толькі тады, калі ўсе да апошняга чачэнца будуць знішчаны, а тэрыторыя Ічкерыі ператворыцца ў чорную спаленую раўніну. Прычынай правядзення гэтай акцыі стаў яшчэ і выпадак у Сернаводску, калі спецыяльным падраздзяленнем расійскіх войск было ўзята 700 жыхароў гэтага сяла, з ліку якіх пасля катаванняў 500 чалавек было аддадзеных на выкуп, а 200 асоб — вывезеных у невядомым напрамку. Гэта красамоўнае пацвярджэнне таму, што вайна здаўна вядзецца супраць мірнага насялення.

Ларыса УМАРАВА, маці траіх дзяцей, 37 гадоў: — Гэтая вайна непатрэбная ні рускаму чалавеку, ні чачэнцу. Яна вядзе толькі да ўзяемнай нянавісці. Многія чачэнскія дзеці нарадзіліся і выраслі на вайне, і ўжо скора змогуць падняць вінтоўку. Толькі свабода Ічкерыі дасць ім магчымасць трымаць не ружжо, але школьны падручнік. Усе пытанні трэба вырашаць мірным шляхам. Лепшыя бясконцыя перагаворы, чым бясконцая вайна. Але з кожным днём становішча ўскладняецца. Неўзабаве можа аказацца запозна.

У галадоўцы салідарнасці ўдзельнічаюць таксама бежанцы з іншых рэспублік былога Савецкага Саюза. Гаворыць **грамадзянін Беларусі, настаўнік, 48 гадоў:** — Гэта проста парадокс. Я не памылюся, калі скажу, што ніводзін нармальны жыхар Зямлі (апрача можа некаторых нягоднікаў) не жадае забіваць сабе падобных. Тым не менш войны існуюць. Кожны сумленны чалавек павінен выказацца супраць любых войнаў. Сёння ідзе вайна ў Чачні, заўтра можа быць у Беларусі. Таталітарызм заразлівы не толькі для палітыканаў і кіруючых колаў, але і для народа. Мая нацыянальнасць — рускі. Мне сорамна за расійскае кіраўніцтва і ваенных.

Гутарыў Аляксандр СУВОРАЎ

Форум беларусаў свету

[1 ☞ *працяг*]

пасольства ў Маскве і аказвае ім падтрымку. Такім чынам у Расіі, як адзначыў Генадзь Лех, стварылася шчырая і няшчырая дыяспара. Частка дэлегатаў, галоўным чынам з Расіі і Украіны, пакарысталася запрашэннем урада і прыняла ўдзел у спатканні ў Савеце Міністраў.

Аб непазбежным паглыбленні расколу дыяспары ва ўмовах існуючага рэжыму сведчыць таксама пасланне прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі суайчыннікам далёкага і блізкага замежжа, зачытанае Іванам Яновічам на другі дзень з'езда (некаторыя палічылі гэта знакам непашаны). У ім аптымістычна гаварылася пра дасягненні Рэспублікі Беларусь на шляху будаўніцтва гарманічнага і сацыяльна справядлівага грамадства і пра перакананасць Лукашэнкі ў тым, што „прыспеў час падняць супрацоўніцтва нашай радзімы з беларусамі і выхадцамі з Беларусі іншых нацыянальнасцей на якасна новы ўзровень". А для гэтага напэўна паслужыць планаваны ўладамі на лістапад гэтага года Кангрэс беларусаў свету.

III З'езд прыняў праграму „Замежная беларуская супольнасць у XXI стагоддзі", дэкларацыю „Беларуская дыяспара і свет", заявы „Аб падтрымцы МГА ЗБС „Бацькаўшчына" і кансалідацыі ў беларускай дыяспары" і „Аб падтрымцы беларускай мовы" (дэлегаты звярнуліся да ўрада з патрабаваннем вярнуць беларускай мове статус адзінай афіцыйнай дзяржаўнай мовы).

З'езд адкрыўся і закончыўся гімнам — старажытнай мелодыяй з „Полацкага сшытка" ад 1640 года, апрацаванай для сімфанічнага аркестра кампазітарам Вячаславам Кузняцовым. Гімн будзе музычным сімвалам ЗБС „Бацькаўшчына". На словы да яго будзе аб'яўлены конкурс.

Насуперак меркаванням дзяржаўных чыноўнікаў, з'езд у палітычнае шоу не ператварыўся. Наадварот, быў ён, як гаварылі ўдзельнікі папярэдняга з'езда, больш канструктыўны, а прамоўцы пазбягалі палітычных тэм, як хаця б надыходзячых прэзідэнцкіх выбараў. Нягледзячы на палітычную стрыманасць апошняга форуму беларусаў свету, цяжка спадзявацца на падтрымку ўлад у выкананні прынятай праграмы, дзе многія прапановы адрасуюцца паасобным міністэрствам і дзяржаўным камітэтам. Для гэтага патрэбна палітычная воля, а такой, як паказала падрыхтоўка і ход з'езда, няма.

Віталь ЛУБА

Разанаў у Мінску

Тыдзень з лішнім прабыў Мінску паэт Алесь Разанаў, які ў пачатку студзеня г.г. выехаў у Нямеччыну па запрашэнні Міжнароднага парламента пісьменнікаў. Гэта самая доўгая „камандзіроўка" Алеся Сцяпанавіча — яна разлічана на год. Аднак назаўсёды пакідаць Беларусь ён не думаў. А на „пабыўку" прыязджаў па асабістых справах. Размову аб сваім гановерскім перыядзе жыцця Алесь Разанаў прапанаваў адлажыць да жніўня, калі яшчэ раз прыедзе ў Мінск. Зрэшты, паэт заўсёды аддаваў перавагу жыць, паводле яго слоў, „на грані паміж вядомым і невядомым".

Белорусская деловая газета № 997 ад 13.07.2001 г.

Лукашэнку можа быць цяжка

Як і меркавалася, беларускія ўлады не дапусцілі ў выбарчыя камісіі прадстаўнікоў апазіцыйных партый і грамадскіх арганізацый. Увайшлі туды людзі, якія ўжо маюць вопыт фальсіфікацый рэферэндумаў і выбараў. Такім чынам Аляксандр Лукашэнка забяспечыў сябе „правільны" падлік галасоў выбаршчыкаў. Але ад непрыемнасцей у час выбарчай кампаніі гэта яго не абароніць.

Мала таго, што супраць яго выступае апазіцыя, дык пачалі выказвацца былыя самыя блізкія паплечнікі. Днямі загаварыў былы кіраўнік справамі прэзідэнта Іван Ціцянкоў. У інтэрв'ю газеце „Дзень" ён расказаў пра некаторыя падрабязнасці мінулай перадвыбарчай кампаніі А. Лукашэнкі, пра стыль яго працы, пра фінансаванне так званага „прэзідэнцкага фонду". Згодна выказванням І. Ціцянкова, у сваёй знакамітай антыкарупцыйнай прамове ў 1994 годзе А. Лукашэнка выкарыстаў неўдакладненыя факты, але галоўнае было спадабацца электарату. Каманды ў яго не было тады, няма і зараз. Працуе толькі першую палову дня, у другую бавіць час у Драздах, гуляючы ў тэніс або хакей. Свой „фонд" папаўняе за кошт продажу зброі ў Турцыю і Ірак. Служба аховы А. Лукашэнкі з 1999 года павялічылася прыкладна ў 200 разоў. Сам І. Ціцянкоў адмяжоўваецца ад дзеянняў А. Лукашэнкі і лічыць сябе невінаватым. Ён нават жадае, каб у Беларусі прайшлі дэмакратычныя выбары. Але ў такім выпадку яму не пазбегнуць адказнасці не толькі за ўдзел у фінансавых махінацыях свайго былога боса, але і за знявагу нацыянальнай годнасці беларусаў. Менавіта І. Ціцянкоў у 1995 годзе падзёр на кавалкі бел-чырвона-белы сцяг, які быў зняты з Дома ўрада пасля „рэферэндуму".

Іншы былы памагаты А. Лукашэнкі генерал-маёр Валеры Кез ужо пакаяўся праз газету „Народная воля" перад дэпутатамі Вярхоўнага Савета 12-га склікання за фізічнае ўздзеянне на іх у час галадоўкі ў 1995 годзе. У сваім інтэрв'ю ён таксама параіў некаторым сваім калегам азнаёміцца з крымінальнымі справамі і лёсам кіраўнікоў НКУС БССР 1937-1939 гадоў, якія аддана выконвалі загады Сталіна.

Такія выказванні, што кампраметуюць Лукашэнку, з'яўляюцца яшчэ да пачатку агітацыйнай кампаніі. Тым часам скончыўся тэрмін збору подпісаў грамадзян за вылучэнне кандыдатаў у прэзідэнты. Гэтая працэдура паказала, што ўлады будуць рабіць усё, каб забяспечыць перамогу А. Лукашэнку. Подпісы за яго збіраліся ў прымусовым парадку. У недзяржаўных выданнях было пададзена шмат вестак пра парушэнні дабраахвотнасці грамадзян паставіць свой подпіс з боку кіраўнікоў прадпрыемстваў. А зборшчыкам подпісаў за канкурэнтаў чыніліся ўсялякія перашкоды. Былі выпадкі канфіскацыі падпісных лістоў міліцыяй, адмовы мясцовых выканкамаў завяраць лісты пячаткай (калі паставяць пячатку, дык не тую). Усё гэта раздражняе людзей і рэйтынгу Лукашэнку не павышае. Тым больш, што канкурэнты ўсё роўна здолелі набраць неабходную колькасць галасоў. Па папярэдніх вестках з апанентаў сённяшняга кіраўніка дзяржавы найбольшага поспеху дабіліся ініцыятыўныя групы Уладзіміра Ганчарыка і Сямёна Домаша. Хутчэй за ўсё яны і будуць прэтэндаваць на ролю адзінага кандыдата ад апазіцыі. Аднак ці пагодзяцца іншыя зняць свае кандыдатуры? Прынамсі пакуль „пяцёрка" кандыдатаў ад дэмакратычных партый і рухаў (Уладзімір Ганчарык, Сямён Домаш, Сяргей Калякін, Павел Казлоўскі і Міхаіл Чыгір) пацвярджаюць намер ісці на выбары адзінай камандай і ўрэшце вылучыць аднаго з пяці.

Зараз Цэнтрвыбаркам павінен праверыць дакладнасць падпісных лістоў і назваць імёны афіцыйных кандыдатаў у прэзідэнты. Вось тады можна будзе адкрыць людзям сапраўдны твар А. Лукашэнкі не толькі праз нешматлікія наклады незалежных газет, але і праз улёткі, на мітынгах і сходах. Невядома хто з былых вернападданых дыктатара адкрые чарговую таямніцу. А за свае сем гадоў кіраўніцтва краінай А. Лукашэнка паспеў пакрыўдзіць шмат каго з блізкіх да „двара" людзей. Няхай нават праверaны Цэнтрвыбаркам і забяспечыць „перамогу", лёс Мілошавіча можа напаткаць А. Лукашэнку кожную хвіліну. А ведаючы яго пастаянны неспакой за сваю асобу, А. Лукашэнку не пазайздросціш.

Зміцер КІСЕЛЬ

Ці будуць настаўнікі касіць сена?

Выступленне абласнога камітэта прафсаюза работнікаў навукі і адукацыі дало свае вынікі. Разам з Івацэвіцкім райкамам прафсаюза, якія першыя забілі трывогу яшчэ ў мінулым годзе, педагогі выступілі супраць патрабавання райвыканкамаў, якія прадпісавлі кожнаму настаўніку накасіць па 400 кілаграмаў сена, каб такім чынам дапамагчы сялянам з нарыхтоўкаю кармоў на зіму.

Механіка была простай: даведзены да раёнаў план распісваўся толькі па школах. На кожную прыпадала прыкладна па 8-10 тон. Дзіцячыя сады, дзе калектывы ў асноўным жаночыя, не складалі выключэння. Педагогі і выхавацелі павінны былі касіць, палоць буракі і выконваць іншыя працы.

Але хіба гэта ўваходзіць у іхнія непасрэдныя абавязкі? А як з арганізацыяй навуковага працэсу? Прадугледзіўшы такую сітуацыю сёлета, абкам прафсаюза звярнуўся з лістом да абласной пракуратуры: просім даць прававую ацэнку дзеянням прадстаўнікоў улады на месцах, разабрацца і адказаць істотна на пытанне. Адказу пакуль няма, хоць месяц ужо прайшоў. Аднак у райвыканкамах з'явілася распараджэнне губернатара вобласці, згодна якому забараняецца прыцягваць да сенажаці настаўнікаў.

„Навіны Хартыі '97", 13.07.2001 г.

„Кругасветка" вакол Брэста

Брэст — буйнейшы чыгуначны вузел у Еўропе. Старыя паравозы сталі музейнымі экспанатамі. Сярод іх машыны пачатку XX стагоддзя, паравозы, якія цягнулі ў саракавых ваенныя эшалоны. Сярод паравых машын ёсць больш сучасны цеплавоз. У яго таксама свая гісторыя: калісьці падвозіў платформы з ракетамі на стартавую пляцоўку аднаго з савецкіх касмадромаў. Часам паравозы арандуюць кінастудыі. Адна з машын водзіць нават турыстычныя цягнікі.

Цяпер у Брэсце група энтузіястаў запрапанавала кароткія турыстычныя маршруты па ваколіцы цягніком, які цягнуць будзе паравоз. Рэтра-ідэю падтрымоўваюць вельмі многія. Слова за рашэннем гарадскіх улад.

Анатоль ПАЛОНСКІ, Брэст

Купальская ноч у Белавежы

7 ліпеня, калі Праваслаўная царква ўшаноўвае памяць св. Іаана Хрысціцеля, у Белавежы адзначалася Купалле. Пачалося яно каля 9 гадзіны вечарам каляровым карагодам гуртоў і выступленнем старшыні ГП БГКТ Яна Сычэўскага. Прывітаў ён белавежскую публіку на старажытнабеларускім святе, якое ў Белавежы адбываецца ўжо 17 раз. Сярод гасцей можна было заўважыць генеральнага консула РБ у Беластоку Леаніда Каравайку, прэс-сакратара Міністэрства замежных спраў РБ Паўла Латушку, палітычных дзеячаў — Владзімежа Цімашэвіча, Мікалая Яноўскага і Сяргея Плеву. Былі таксама прадстаўнікі самаўрадаў Белавежы, Гайнаўкі, Бельска-Падляшскага і Беластока.

Канцэрт вялі — Вялянціна і Ева Ласкевіч, Алесь Лойка і Юрка Астапчук (верхні здымак). На сцэне выступіла пад 20 гуртоў з Падляшскага ваяводства і тры калектывы з Беларусі.

Свята пачалося песняй „Купалінка” ў выкананні „Прымакоў”, якія пры нагодзе зрабілі рэкламу сваёй новай чацвёртай ужо аўдыёкасеты. Потым выступалі гурты — „Расспяваны Гарадок”, „Васілёчкі”, „Ас”, „Цаглінкі”, „Маланка”, „Хлопцы-рыбалоўцы”, „Рэчанька”, „Арэшкі”. З-за мяжы ў Белавежу прыехалі „Грымата” са Слоніма, „Вербніца” з Пружан і танцавальны гурт „Гродзенскія карункі” з Гродна.

Вялікае ўражанне ў публікі выклікала выступленне Алы Каменскай з сынам Давідам, якія заахвоцілі публіку да спявання. Паяўленне на сцэне гурту „Ас”, а потым „Прымакоў” давяло да таго, што слухачы пачалі не толькі спяваць, але і танцаваць. Старыя, добравядомыя беларускія песні, называныя часам свойскімі, у новай апрацоўцы падкупілі публіцу. Нягледзячы на паходжанне ці веравызнанне ўдзельнікі Купалля даказалі, што культура і песня пераадольваюць усе бар'еры і аб'ядноўваюць людзей.

Сёлетняе свята прыцягнула ў Белавежу каля 7 тысяч аматараў народнага гуляння. Большасць публікі складалі маладыя людзі, якія нават пяшком дабіраліся на Купалле. З вянкамі на галовах, з півам у руках гулялі разам са старэйшымі ўдзельнікамі.

Купалле закончылася апоўначы пусканнем вянкоў на ваду (ніжні здымак). Цёплы вечар як і ахвота паказаць сваю смеласць схілілі маладых хлопцаў кідацца ў ваду і лавіць вянкі. На жаль, выплятаюць іх старэйшыя замужнія жанчыны, а не дзяўчаты.

Купальская ноч мела не толькі культурны, але і рэкламны ды выбарчы характар. Публіка атрымала поўную інфармацыю аб партыйнай прыналежнасці гасцей і аб дзейнасці спонсараў. У гэтым годзе арганізатары атрымалі высокую ацэнку публікі. На пытанне: „Як справіліся арганізатары?” людзі адказвалі адным словам: „Цудоўна!” Ад пачатку да канца імпрэзы, і той у Старой Белавежы, як і на дыскатэцы каля

сцэны людзі гулялі і радаваліся, аддаючы пашану прыродзе.

Кветка-папараць — сімвал поўнага шчасця, зацвіла ў гэтую ноч у кожнай душы. Былі аднак і такія, якім да шчасця, апрача спеваў і танцаў, чагосьці бракавала і шукалі яны цудоўную кветку па Белавежскай пушчы да самой раніцы.

Паўліна ШАФРАН

Фота аўтара

Апоўначы шукалі папараць-кветку

6 ліпеня ў Нараўцы жыхары гэтай гміны святкавалі Купалле. Сабралася шмат народу. А гадзіне 21 на сцэне мясцовага амфітэатра выступілі першыя з дзесяці прыехаўшых фальклорных калектываў Гайнаўскага, Беластоцкага і Бельскага паветаў. Цешылі яны песнямі, танцамі ды абрадавымі сцэнкамі. Кожны з іх зарэкамендаваў сябе як мог найлепш. Усе гурты прывезлі з сабой абрадавыя вянкі з жывых кветак.

З канцэртам выступілі таксама калектывы з Беларусі: „Вербніца” з Пружан, „Грымата” са Слоніма і „Гродзенскія карункі” з Гродна. Калектывы з Беласточчыны і з Беларусі спявалі, ігралі і танцавалі на сцэне да поўначы. Кожнае іх выступленне было цікавае, непаўторнае, захапляльнае. „Вербніца” і „Грымата” праспявалі па восем песень: пра прыгажосць роднага краю і пражываючых у Беларусі палешукоў, лірычных — пра каханне, жартоўных ды застольных. А маладзёжныя „Гродзенскія карункі” заваражылі цудоўнымі танцамі.

Ажно прыйшла пара на ацэнку вянкоў ды абрадавых сцэнак. Журы ўзнагародзіла найпрыгажэйшы абрадавы вянок калектыву „Каліна” з Дашоў ды найлепш сыграны абрадавы спектакль „Бяленне саматканага льнянога палатна” ў выкананні фальклорнага калектыву з Дабрывады. Пераможцы атрымалі кубкі войта Нараўчанскай гміны ды дырэктара Гміннага асяродка культуры.

Апоўначы былі феерверкі, а пасля моладзь пайшла шукаць папараць-кветку. Каму гэта ўдалося, таксама атрымаў узнагароду.

Затым мастацкія самадзейныя гурты, спяваючы „Купалінку”, панеслі вянкі з запаленымі свечкамі на раку Нараўку. Юнакі скакалі ў ваду і накіроўвалі вянкі на рачную плынь.

Вянок нясуць члены вакальна-інструментальнага калектыву Гайнаўскага дома культуры.

На беразе ціхаплыннай Нараўкі ўдзельнікі Купалля расклалі кастры ды пад гукі гуртоў „Архіў” з Міхалова і „Ас” з Беластока бавіліся да белага рання. Усім маладым і старэйшым было цікава і прыемна гуляць у гэтую цудоўную ліпеньскую ноч.

Тэкст і фота Янкі ЦЕЛУШЭЦКАГА

Фэст у Кляшчэлях

Цёплаю летняю парою добра пакупацца ў рэчцы ці ў вадаёме. Улады Кляшчэль задбалі пра гэта і пабудавалі басейн для плавання. Асабліва ў вольныя ад работы дні ў басейне многа аматараў плавання, а найбольш дзяцей. Гэтак было і ў нядзелю, 1 ліпеня. Пасля абеду ля басейна прайшоў яшчэ адзін атракцыён — беларускі фэст, арганізаваны мясцовымі ўладамі і Галоўным праўленнем Беларускага грамадска-культурнага таварыства.

Народны фэст пачаўся песняй „Беластоцкі край, мая радзіма” (на словы Алеся Барскага). Пры басейне расстаўлены былі лавы і крэслы, падрыхтавана сцэна. Сабралася многа людзей. З прывітальным словам выступіў бурмістр Аляксандр Сяліцкі, а пасля голас узяў старшыня ГП БГКТ, пасол Сейма Ян Сычэўскі. Ён — кандыдат у сенатары і менавіта таму прадставіў сваю выбарчую праграму, у якой найбольш увагі адводзілася праблемам нацыянальных меншасцей і эканамічна-гаспадарчым пытанням Падляшскага рэгіёна.

Затым Ева Ласкевіч, якая супольна з Юркам Астапчуком вяла канцэрт, запрасіла на сцэну гасцей з Беларусі — мастацкі народны калектыў „Калі ласка” з Ліды. І ўсе шаснаццаць чалавек пад гукі гармоніка, скрыпкі, бубна, дудкі, кантрабаса і трашчоткі пачалі сваё выступленне з аднайменнай песні:

Запрашаем вас да нас
Сёння госці вы ў нас, калі ласка,
Вам жадаем доўга жыць...

Вельмі прыгожа танцавалі і спявалі артысты з Беларусі. Высокі клас песеннага мастацтва паказалі салісткі Іна Трацяк, Анна Бабонік і саліст Уладзімір Некрашэвіч. Лідчане на пачатак запрэзентавалі палову свайго рэпертуару, а другая частка мела завяршыць фэст.

Далей выступілі: фальклорны гурт з Дашоў, дуэт Люба Гаўрылюк і Уладзімір Іванюк з беластоцкага калектыву „Крыніца”, гурт з Дабрывады, сямятыцкі „The Best” і новаствораны кляшчэлеўскі жаночы калектыў. Калі на сцэну выйшлі „Прымакі”, пайшоў дождж, проста лівень. Людзі сталі хавацца ад праліўнога дажджу, урэшце ўцякаць з канцэрта. І так канцэрт не быў даведзены да канца і працягваўся ўсяго паўтары гадзіны.

Пасля паўгадзіннага патопу мастацкія калектывы паехалі на вячэру ў мясцовую школу. І менавіта там адбыўся працяг канцэрта. З завяршальнай прамоваю і падзякай калектывам выступіў бурмістр, які ўручыў гасцям з Ліды букет кветак і падарак. Уручыў ён таксама кветкі вядучай канцэрт Еве Ласкевіч. Консул Рэспублікі Беларусь Аляксандр Карачун, які прыехаў на фэст з жонкаю, дзякаваў мясцовым уладам і Галоўнаму праўленню БГКТ за ўмацоўванне беларускай культуры на Беласточчыне. Са словамі падзякі за цёплы прыём выступіў прадстаўнік Лідскага калектыву. Старшыня і сакратар ГП БГКТ Ян Сычэўскі і Валянціна Ласкевіч таксама шчыра падзякавалі мясцовым уладам і ўсім выканаўцам беларускіх песень.

Міхась ХМЯЛЕЎСКІ

PS. Калектывы „Калі ласка”, „The Best” і „Прымакі” 30 чэрвеня выступілі ў Нарве з нагоды Дзён Нарвы.

М. Х.

Мне падабаецца мая праца

Гаворыць генеральны консул Рэспублікі Беларусь у Беластоку Леанід КАРАВАЙКА.

Вялікую частку свайго жыцця правялі Вы за мяжою. Дзе было найцікавей?

За мяжою я пражыў 14 гадоў. Хаця ў Беластоку ўсяго месяц, але мне тут найбольш цікава і перш за ўсё з пункту гледжання чалавечых кантактаў.

Гэта першая Вашая пабыўка ў нашым горадзе, ці прыязджалі раней?

У 1990 годзе мне давялося працаваць тры месяцы ў Варшаве ў консульскім аддзеле амбасады былога СССР. Тады прыязджаў я і ў Беласток, каб паглядзець, якія існуюць умовы для адкрыцця беларускага консульства. Дык можна сказаць, што сярод беларускіх дыпламатаў я быў тут першапраходцам. Наведаў тады і Гайнаўку, і Супрасль. Быў у рэдакцыі „Нівы". На Беласточчыну прыязджаў некалькі разоў і пазней: з тагачасным міністрам замежных спраў Пятром Краўчанкам, з Алегам Трусавым і з пакойным гродзенскім губернатарам Дзмітрыем Арцыменем.

Ці Вашае назначэнне і, разам з гэтым, папаўненне саставу Генеральнага консульства Рэспублікі Беларусь у Беластоку звязанае з новымі задачамі, якія ставяцца перад установай?

Працы тут заўсёды хапала. Цяпер разам са мною ў Беластоку чатыры дыпламаты і ніводзін з іх не лішні.

Ці рыхтуецеся ўжо да ўвядзення візавага рэжыму між Польшчай і Беларуссю? Калі гэтага можна чакаць?

Скажу так, мы не імкнемся, каб дадаткова ўскладняць праезд праз мяжу, асабліва людзям, якія ля яе жывуць. Ёсць жа і сваяцтвы па абодвух баках мяжы, ёсць сталыя гандлёва-эканамічныя сувязі. Я спадзяюся таксама, што візавы рэжым не будзе ўведзены ў гэтым годзе.

Хто ў гэтай справе мецьме рашаючы голас: Мінск, Варшава ці можа Брусель?

Я лічу, што Беларусь і Польшча ў стане вырашыць для сябе гэта пытанне самастойна.

Ці ў выпадку ўвядзення візаў бяруцца пад увагу аблягчэнні пры праездзе праз мяжу для жыхароў памежжа, такія як хаця б між Польшчай і Чэхіяй? Там жыхары прыгранічных гмін могуць перайсці на другі бок на ўнутраны пашпарт (dowód osobisty)?

Калі будзем гаварыць аб дэталях, то наш бок будзе імкнуцца да нейкіх формаў спрашчэнняў пры праездзе праз мяжу для жыхароў памежжа. Якія рашэнні будуць прыняты, будзе залежаць ад перамоў з польскімі калегамі.

Сустракаліся Вы ўжо з уладамі Падляшскага ваяводства?

Я атрымаў экзекватуру з Міністэрства замежных спраў Польшчы толькі 22 чэрвеня. Да гэтага часу не магло адбывацца ніякіх афіцыйных сустрэч. Цяпер рыхтуемся да сустрэчы з трыма ваяводамі: падляшскім, люблінскім і вармінска-мазурскім, бо гэтыя тры ваяводствы акрэслены міністрам замежных спраў Польшчы як консульская акруга нашай консульскай установы.

З ліпеня Вы ладзілі прыём з нагоды Свята незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Так як і ў папярэдніх гадах не прысутнічалі на ім ні ваявода, ні маршалак Падляшскага ваяводства.

Гэта справа палітычнай культуры.

Ад самага пачатку працы Генеральнага консульства Рэспублікі Беларусь ідзе гаворка пра адпаведнае памяшканне. Гэтае — па вуліцы Варынскага — замалое на патрэбы такой установы. Ці перад Вамі стаіць задача закончыць урэшце пошукі адпаведнай сядзібы?

Я спадзяюся, што ў гэтым годзе справа з сядзібай консульства закончыцца паспяхова.

У апошні час многа гаварылі пра хуліганскія напады на беларускіх грамадзян у Беластоку, пра крадзяжы, пабоі. Што робіцца, каб прадухіліць такія здарэнні?

Мы асцерагаем нашых грамадзян, каб не падарожнічалі ноччу, каб ездзілі толькі галоўнымі дарогамі. Беластоцкая паліцыя таксама вядзе асведамляючую працу. Хачу падкрэсліць добрае супрацоўніцтва з паліцыяй. Дзякуючы гэтаму знізілася колькасць злачынстваў у дачыненні да грамадзян Рэспублікі Беларусь на тэрыторыі Падляшскага ваяводства.

Я хацеў бы яшчэ спытаць Вас пра Вашыя асабістыя справы. Вы тут адзін, ці з сям'ёю?

З жонкай. Нашы сыны ўжо вялікія і засталіся ў Мінску. Старэйшы, якому 22 гады, пайшоў па слядах бацькі — вучыцца ў Лінгвістычным універсітэце на перакладчыцкім факультэце. Малодшаму 18 гадоў і ён закончыў — на адны пяцёркі — першы курс юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Мая жонка інжынер, закончыла Мінскі тэхналагічны інстытут, але часова не працуе па сваёй прафесіі, а спадарожнічае мне.

Беласток, гэта добры трамплін для далейшай кар'еры беларускіх дыпламатаў. Як думаеце, на якую пасаду Вы трапіце, пасля заканчэння тэрміну Вашых паўнамоцтваў у Беластоку?

Ха-ха, дайце дажыць. Ведаеце, я амаль увесь час быў консулам і мне гэтая праца вельмі падабаецца. Я лічу, што добрым консулам можа быць толькі той, хто праблемы іншага чалавека можа прапусціць праз сваё сэрца і сваю душу. Гэта адбіваецца на здароўі, але калі да цябе чалавек прыходзіць з усмешкай і з усмешкай выходзіць, гэта значыць, што ты нездарма пражыў дзень. Я добра адчуваю сябе як консул і не хацеў бы мяняць прафесію.

Хто пераможа на прэзідэнцкіх выбарах у Беларусі?

Пераможца.

Інтэрв'ю ўзяў Мікола ВАЎРАНЮК

Леанід КАРАВАЙКА нарадзіўся 19 чэрвеня 1954 года ў вёсцы Агароднікі Лідскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыў сярэднюю школу ў Бярозаўцы і перакладчыцкі факультэт Інстытута замежных моў у Мінску па спецыяльнасці французская і англійская мовы. Пад час вучобы выязджаў на паўгадовую стыпендыю ў Грэнобль. У 1976-77 гадах быў перакладчыкам на металургічным заводзе ў Анабе (Алжыр). У 1976 годзе паўгода працаваў настаўнікам англійскай мовы ў Бярозаўцы, а затым паўтара года служыў у войску. 1979-80 — вучоба на курсах перакладчыкаў ААН пры Інстытуце замежных моў імя М. Тарэза ў Маскве. 1981-87 — праца ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Нью-Йорку. 1987-88 — праца ў Доме дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі ў Мінску. 1988-92 — у Міністэрстве замежных спраў Беларусі ў пратакольна-консульскім аддзеле. У 1993-95 гг. быў першым генеральным консулам Беларусі ў Нью-Йорку. З 1995 па 1997 быў начальнікам упраўлення краін СНД, Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, начальнікам Сакратарыята міністра замежных спраў Беларусі. 1997-98 — у Босніі і Герцагавіне ў якасці назіральніка АБСЕ. 1998-2001 — начальнік консульскага ўпраўлення МЗС Беларусі. 21 красавіка 2001 года — прызначаны ўрадам Беларусі генеральным консулам у Беласток.

Пераможцаў не судзяць

Слабадан Мілошавіч прайграў вайну на Балканах, у выніку чаго апынуўся перад Міжнародным трыбуналам у Гаазе. Сербы ў вайне з харватамі і мусульманамі, а пасля з пактам НАТА не мелі саюзнікаў. Расія, якая апынулася ў эканамічнай залежнасці ад Захаду, на практыцы сваю пазіцыю выявіла толькі ў дыпламатычных пратэстах супраць знішчання сербскіх гарадоў і гаспадарчай інфраструктуры НАТАўскай авіяцыяй. У канцы Масква адобрыла таксама адлучэнне Косава ад Сербіі і этнічныя албанскія чысткі ў гэтай правінцыі. За здачу НАТАўскаму блоку Сербіі Расія праўдападобна атрымала свабоду фарміравання сітуацыі на Беларусі. Немцы ад паўтара года амаль адкрыта пачалі лічыць Беларусь расійскай зонай уплываў.

Мілошавіч — несумненны дыктатар і злачынца, але такіх як ён у свеце нямала. Забойцаў са званнем прэзідэнтаў, прэм'ер-міністраў, міністраў можна таксама знайсці сярод харвацкіх, баснійскіх, турэцкіх, ізраільскіх, палесцінскіх палітыкаў, не ўпамінаючы албанскіх, аб якіх нават заходняя прэса піша, што гэта мафія. Выглядае на тое, што пакт НАТА, пачынаючы два гады таму вайну з сербамі, змагаўся за інтарэсы гандляроў наркотыкамі, а прапаганда ўсё гэта прадставіла як змаганне з дыктатурай Мілошавіча, які быццам бы масава мардаваў албанцаў у Косаве. Рэпартажы Вальдэмара Мілевіча ў тэлебачанні ці фельетоны Адама Міхніка, Давіда Варшаўскага, Леапольда Унгера ў „Газеце выбарчай" прадстаўлялі сербаў амаль як гестапаўцаў. Гаварылася тады пра сотні тысяч албанскіх ахвяр. Ніхто і ніколі іх не знайшоў. Аднак пасля ў „дэмакратычных і свабодных" сродках масавай інфармацыі нічога не гаварылася пра забойствы албанцамі косаўскіх сербаў і цыганоў. Нават калі харвацкі прэзідэнт некалькі дзён таму аб'явіў, што двух яго генералаў — ваенныя злачынцы, вінаватыя ў масавых забойствах сербаў у Крайне і павінны яны быць пастаўлены перад судом, журналіст польскага тэлебачання Вальдэмар Мілевіч, каментуючы гэтую падзею, перш за ўсё расказваў пра сербскія зверствы ў Босніі.

Працэс Мілошавіча перад Міжнародным трыбуналам быў бы апраўданым, калі б побач яго сядзелі там харвацкая, мусульманская і албанская эліты ўлады. Усе яны аднолькава вінаватыя ў пакутах мільёнаў грамадзян былой Югаславіі. Усё аднак адбываецца паводле неафіцыйнай амерыканскай дактрыны замежнай палітыкі, якая гаворыць, што калі нейкай краінай кіруе „сукінсын", трэба толькі вызначыць ці гэты сукінсын наш ці не наш. Калі ён наш — тады ўсё нармальна, калі не наш — трэба змагацца за чалавечыя правы яго падданых і яшчэ за штосьці, што называюць дэмакратыяй. У Харватыі, кіраванай памерлым нядаўна Франіем Туджманам, былі вернуты амаль усе фашыстоўскія сімвалы усташаўскай дзяржавы. Усташы, у час другой сусветнай вайны, прадэманстравалі нашмат большае зверства чым гітлераўцы. Аднак амерыканцам нішто не перашкаджала падтрымаць спадкаемцаў усташаў у вайне з сербамі. Ніхто ў свеце таксама не пратэставаў, калі харваты выгналі з Крайны звыш ста тысяч сербаў, а пару тысяч замардавалі. Ніхто з НАТАўскіх прапагандыстаў, а таксама ні Вальдэмар Мілевіч, ні Адам Міхнік, ні прэзідэнт Кваснеўскі не заўважылі гэтага злачынства. Усе аднак згодным хорам выказвалі абурэнне, калі сербская армія і паліцыя пачала ў Косаве акцыю супраць албанскіх мафіёзных баевікоў, якія назвалі сябе Вызвольнай арміяй Косава.

Апрача Людвіка Стомы, фельетаніста штотыднёвіка „Палітыка" ніхто ў Польшчы не адважыўся сказаць праўду аб сітуацыі на Балканах. Ніводзін палітык не хацеў рызыкаваць палітычнай кар'ерай, усе дбалі пра тое, каб іх выказванні супадалі з НАТАўскімі зводкамі і камюніке. Мінула два гады і ў заходнееўрапейскай прэсе паказалася шмат публікацый, якія сведчаць пра тое, што тамашнія эліты пачынаюць бачыць вайну супраць Сербіі як нейкі палітычны і бессэнсоўны фарс. Апошнім часам у штотыднёвіку „Палітыка" (ад 7 ліпеня 2001 года) быў змешчаны артыкул Адама Бальцэра і Марціна Мэлера пра албанскія ваенныя фарміраванні на Балканах. Аўтары не сумняваюцца ў тым, што чарговыя мілітарныя групоўкі, якія называюцца вызваленчымі арміямі — гэта мафіёзныя банды, якія ў выніку паслаблення сербскіх ці македонскіх улад пераймаюць уладу і арганізуюць на кантраляваных сабой тэрыторыях гандаль наркотыкамі. Нават македонская дзяржава аказалася слабейшай за албанскіх баевікоў.

Знішчэнне Сербіі пактам НАТА вясной 1999 г. дало Захаду геапалітычны кантроль над паўднёва-ўсходняй Еўропай, але парушыла існуючую там раўнавагу сіл. Албанцы, маючы падтрымку адзінаверцаў з арабскіх краін, безупынна атакуюць. Нядаўні саюзнік Амерыкі — Македонія — вымушана цяпер сама змагацца з мусульманскімі баевікамі. Нішто не паказвае канца гэтай вайны. Пасля рашэння аб правядзенні вайны ў абароне інтарэсаў албанскай мафіі, ніхто з заходніх палітыкаў не адважыцца раскручваць прапагандысцкую акцыю супраць нядаўніх саюзнікаў. Таму вінаватым усяму закалоту на Балканах аказаўся Мілошавіч. Неўзабаве былому сербскаму прэзідэнту будзе прадстаўлены вялікі спісак злачынстваў. Чым даўжэйшы будзе гэты спісак, тым большае апраўданне для НАТАўскіх палітыкаў, якія паслалі самалёты на сербскія гарады.

Яўген МІРАНОВІЧ

Выратаваць ад забыцця

У драўляным будынку колішняй Падставовай школы ў Дубічах-Царкоўных будзе працаваць Рэгіянальны музей беларускай культуры і гісторыі „Выратаваць ад забыцця”.

— У музеі думаем паказаць гісторыю нашых зямель, пачынаючы з часоў Кіеўскай Русі і Вялікага княства Літоўскага, спасылаючыся, між іншым, на царкоўныя матэрыялы. Раскажам пра партызанку дваццатых гадоў у Грабаўцы, прадставім іншыя гістарычныя матэрыялы, а не толькі гладункі, — заявіў войт Дубіцкай гміны Анатоль Паўлоўскі.

У старым драўляным будынку будуць знаходзіцца кухня і пакой з колішнім вясковым абсталяваннем і дзве выставачныя залы. У кухні ўжо пастаўлена гліняная хлебная печ, а побач будуць размешчаны старая мэбля і прылады. У пакоі — ложак з пярынай, падушкамі, стол, вышываныя абрусы і сурвэткі, а на сценах — іконы. У выставачных залах размешчаны будуць пастаянныя і часовыя экспазіцыі.

— У пакоі хочам паставіць кросны, каб наведвальнікі маглі папрабаваць ткаць палавікі. Будзе прапанавана ім магчымасць вышываць і біць масла або нешта спячы. У выставачных залах, апрача гістарычных матэрыялаў, плануем паставіць вырабы з ракіты ці іншыя прадметы народнай творчасці. Яшчэ раней думалі мы паказаць школьную залу са старымі партамі і тагачаснымі дыдактычнымі дапаможнікамі, але не ведаем ці ўсе экспанаты памесцім, — сказала дырэктар Гміннага асяродка культуры ў Дубічах-Царкоўных Іаланта Соха, якая назірае за рэалізацыяй праекта стварэння музея. — Музей беларускай культуры будзе адным з многіх атракцыёнаў, якія запрапануем турыстам. Будзе ён, таксама, выкарыстоўвацца для патрэб мясцовага насельніцтва і вучняў.

Дзякуючы малым грантам Цэнтра грамадзянскай адукацыі „Польшча-Беларусь” і гмінным сродкам, музейны будынак атрымаў новыя вокны і дах з гонты. Арганізацыйны камітэт музея хоча выратаваць ад забыцця частку беларускай нацыянальнай спадчыны, якая захавалася ў Дубіцкай гміне. Аргкамітэту можна перадаваць даўнія прадметы штодзённага карыстання, прылады, старую мэблю, сундукі, скрыні, нацыянальную вопратку, абрусы, макаткі, палавікі, прадметы рэлігійнага культу, старыя дакументы, фатаграфіі і памяткі, газеты, скульптуру і старыя карціны. Грашовыя ўзносы на падрыхтоўку музея можна пералічваць на банкаўскі рахунак: **BS w Hajnówce, O/ Kleszczele, nr 80711032-143-36011-1/1**; Гміны асяродак культуры, вул. Галоўная 67, 17-204 Дубічы-Царкоўныя.

Зараз рамантуецца музейны будынак.

Аляксей Мароз
Фота аўтара

Дакумент-унікум

Сцяпана Калішука з Маліннік, які прывозіць гародніну і кветкі на рынак, часта сустракаю ў Чаромсе.

— Ведаеш, Валодзя, — аднойчы сказаў ён, — захавалася ў мяне школьнае пасведчанне матулі ад 1913 года. Хочаш, магу прывезці...

І вось трымаю унікальны дакумент, у якім напісана: „Свидетельство № 282. Предъявительница сего Стемпа Ксенья Васильева, крестьянка Топчыкальского сельского общества, Орлянской волости, Бельского уезда, Гродненской губерніи родившаяся 19 января 1899 года успешно окончила курсъ ученія въ Топчыкальском нар. училище, Бельского уезда, Гродненской губерніи, въ чемъ и выдано ей это свидетельство за печатью Бельского городского училища. 12 август 1913 года”.

— Глянь, як шыкарна афармлена, — гаворыць Сцяпан, — а якая папера!.. І зараз жа прыбаўляе. — Выдатніцай у школе матуля была. Прапанавалі далей вучыцца. У Расію ехаць. Але грошай у бацькоў не было ды і рызыкнуць сумнявалася. Гаварыла, што на экзамен у Дубяжын хадзіла.

— А як навука праходзіла? — цікаўлюся. — Чаго вучылі?

— У асноўным слова Божага. Заняткі цэлы дзень праходзілі. На абед перапынак быў. Ледзь-ледзь „на хаду” перакусвалі, і ўподбегі зноў на заняткі. — А якую памяць мела матуля! Вершы Пушкіна чытала. Ды здароўем добрым карысталася, 99 годзікаў пражыла. Па чужыне ў час бежанства бадзялася. Пра раку Дон успамінала ды тамтэйшых людзей хваліла. „Спагадлівыя людзі былі”, — казала. Ежу і адзенне прыносілі. Было так, што галоднымі спаць клаліся, а калі раніцай на панадворак выходзілі, дык на загаце каля дома ежа ў гаршчочку стаяла. Але найгорш у час рэвалюцыі было. Штораз прыходзілі то белыя, то зноў чырвоныя і ставілі пытанне: на чыім баку стаіш? Патрэбна была кемлівасць, каб ведаць, што каму адказаць. Але дзякуй Богу матуля дамоў вярнулася. Шкада, што нямнога ў маёй памяці засталося ад матуліных успамінаў. Добра, што гэта памятка засталася, — уздыхнуўшы, паказвае на пасведчанне царскага Міністэрства народнай прасветы.

Уладзімір Сідарук



Свидѣтельство.

Предъявительница сего Стемпа Ксенья Васильева, крестьянка Топчыкальского сельского общества, Орлянской волости, Бельского уезда, Гродненской губерніи родившаяся 19 января 1899 года успѣшно окончила курсъ ученія въ Топчыкальском нар. училищѣ Бельскаго уѣзда, Гродненской губерніи, въ чемъ и выдано ей это свидѣтельство за печатью Бельскаго городского училища.

12 августа 1913 года.

Инспекторъ Народныхъ училищъ

Гродненской губерніи

У пошуках фальклору

Пад такім лозунгам 6 ліпеня ў Нараўцы адбыўся раённы конкурс фальклорных самадзейных калектываў з Гайнаўскага, Бельскага і Беластоцкага паветаў. На сцэне ў тамашнім амфітэатры выступілі дзесяць гуртоў і адна салістка. Ацэньвала журы з Ваяводскага асяродка анімацыі культуры ў Беластоку Юзэф Зыськ і Сцяпан Копа.

І так, між іншым, „Цаглінкі” са Старога Ляўкова паказалі „Заручыны” (на здымку), „Родына” з Дубяжына — фрагмент вяселля „Выпраўлянне маладой да шлюбу”, калектыў з Дабрывады — колішняе бяленне саматканага льнянога палатна, а „Крыўчанкі” з Крыўца выканалі прыгожыя сенакосныя песні. Цікава было паглядзець усё гэта на бе-разе ракі. Асабліва міні-спектаклі былі вельмі старанна дапрацаваны.

На ваяводскі агляд мастацкай самадзейнасці паедуць „Крыўчанкі”, „Родына”, абрадавы калектыў з Дабрывады, маладзёжны калектыў народнай песні і танца Гайнаўскага дома культуры і „Мянка” з Мня (Браньская гміна), а таксама салістка Кацярына Ціханюк са Збуча. Агляд адбудзецца 11 жніўня 2001 года ў Цеханоўцы.

Тэкст і фота Янкі Целушэцкага

Зорка

СТАРОНКА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

У сэрцы Беларусі

У час канікул многа падарожнічаем. Раз як турысты, раз як паломнікі, урэшце — як госці. І каму з вас пашчасціцца трапіць у Полацк, яму неабходна наведаць Спаса-Праабражэнскую царкву Еўфрасіннеўскага манастыра. У маленькай царкоўцы дванаццатага стагоддзя, распаложанай на высокім беразе ракі Палаты, знаходзяцца мошчы святой Еўфрасінні. Пакланіцца гэтай святыні прыязджаюць вернікі з усяго свету.

Усярэдзіне царква аздоблена старажытнымі фрэскамі. Многія з іх былі адкрыты рэстаўратарамі з-пад „маладзейшых" напластаванняў алейных фарбаў. Фрэскі з'яўляюцца помнікам полацкага жывапісу, які спалучыў каноны візантыйскага мастацтва і жывапісу Ноўгарада. Воблікі святых, анёлаў уражваюць святасцю і рэальнасцю. Сярод іх Святая Пакутніца Еўфрасіння Полацкая, асветніца і заступніца Беларускай зямлі.

Спаса-Праабражэнская царква была ўзведзена дойлідам Іванам за 30 тыдняў. Пра гэта гаворыцца ў „Жыціі Еўфрасінні Полацкай". Храм мае невялікія памеры: 9,8 х 18,2 м. Яго бакавыя нефы вельмі вузкія, бо ўвесь цяжар асновы барабана выпадае на шэсць падкупальных слупоў. Дойлід дбаў пра вонкавы выгляд царквы, яе відаць здалёк на фоне маляўнічага краявіду. Пасля на ўзор гэтай царкоўкі будаваліся храмы ў Кіеўскай Русі і Маскоўскай дзяржаве.

Усім прыбываючым у гэтае месца неабходна сцерагчы пэўныя прынцыпы. Уваходзячы на тэрыторыю манастыра, трэба захаваць спакой і павагу. Ад дзяўчат патрабуецца праваслаўна-класічнае адзенне. Гэта значыць, трэба мець галаву накрытую хусткай, апрануць спадніцу або сукенку. Хлопцы ў ніякім выпадку не могуць прыйсці сюды ў штоніках. Узамен за належную пашану

Спасаўская царква. Фота Ганны КАНДРАЦЮК

святыні, вы зможаце адчуць цудоўнасць месца. Нават свецкія людзі адчуваюць тут шматвяковую намоленасць і спакой. Манашкі ў адзенні на ўзор св. Еўфрасінні навядуць вам думкі пра часы, калі жыла, працавала і малілася тут беларуская святая.

Ганна КАНДРАЦЮК

Віктар ШВЕД

Лета

Лета, радаснае лета,
Колькі ж велічнай красы!
Край наш сонейкам сагрэты
Поўняць птушак галасы.

Лета, залатое лета,
І прыгожы свет наўкол
Сазываеш школьных дзетак
З нашых гарадоў і сёл.

Лета, казачнае лета,
Навяваеш безліч мар,
Дываном з духмяных кветак
Пакрываеш зямлі твар.

Лета, дарагое лета,
Адпачынку мілы час,
Дзетак абдараеш гэтак
Да навукі ў сіл запас.

* * *

Мая мама
найлепшая!
Мая мама
найпрыгажэйшая!
Умее ўсё
зрабіць!
Урокі дапаможа
рабіць!
Мая мама
найлепшая!
І нікому яе не аддам...

Магдаліна АЎКСЕЦЮК,
V кл. ПШ у Дубічах-Царкоўных

У тэксце выкарыстаны весткі з артыкула Алега Трусава *Спаса-Праабражэнская царква ў Полацку*, „Бярозка" № 3/2001 г.

Фрэскі з альбома „Насценны жывапіс".

Пакацігарошак

(беларуская народная казка)

Жыў дзед з бабаю. Былі ў іх два сыны і дачка Палашка. Прыгожыя выраслі сыны — высокія ды стройныя. А дачка — яшчэ прыгажэйшая.

Сыны з бацькам зямлю аралі, збожжа сеялі, гаспадарку вялі і з гэтага жылі.

Аднаго лета ўправіліся яны загадзя з работаю, усё з поля сабралі, звезлі ды змалацілі.

Паглядзеў бацька на няпоўныя засекі і кажа:

— Вось што, сыны мае любімыя. Збожжа ў нас сёлета не надта зарадзіла. Ці не пайсці нам у заробкі да чужых людзей? Запас бяды не чыніць.

Падумалі браты — і праўда: не шкодзіла б лішні рубель мець у гаспадарцы. За яго можна будзе вясною хлеба прыкупіць, калі свайго не хопіць. Але куды ж пайсці ў заработкі? Скрозь тут бедныя людзі жывуць.

— Схадзіце за пушчу, — раіць бацька. — Можа, там вас хто нойме.

Узялі браты харчоў па торбе і кажуць:

— Калі мы праз тыдзень не вернемся, дык няхай нам Палашка прынясе свежага хлеба.

— А як жа я ведаць буду, куды вам несці? — пытаецца Палашка.

Падумалі браты і кажуць:

— Мы возьмем з сабою куль саломы ды будзем па дарозе церушыць па саломінцы — гэты след і прывядзе цябе да нас.

— Калі так, дык мне не цяжка будзе знайсці вас, — згадзілася сястра.

Сабраліся браты і пайшлі.

Ідуць ды саломай за сабою цярушаць.

Мінулі поле, увайшлі ў цёмную пушчу. А ў той пушчы жыў страшны Цмок з жалезным языком. Убачыў ён, што браты след за сабою пакідаюць, узяў ды перакінуў саломінкі на другую сцежку. А вяла тая сцежка проста да яго касцянога палаца...

Мінуў тыдзень. Не вярнуліся браты. Радуецца бацька:

— Мусіць яны знайшлі там добрую работу. Занясі ты ім, дачушка, свежага хлеба.

Узяла Палашка хлеба, сёе-тое да хлеба ды рушыла ў дарогу. Ідзе і ўсё на саломінкі ўглядаецца. Аж раптам бачыць перад сабою палац — з чалавечых касцей збудаваны, чалавечымі чарапамі накрыты...

Спужалася дзяўчына. „Куды я трапіла?" — думае.

А тут і сам гаспадар выходзіць з палаца — пудзіла паганае.

— А-а, — ухмыляецца ён, — папалася да мяне. Я да цябе даўно прыглядаўся, забраць у свой палац збіраўся. А тут ты і сама прыйшла. Ну, што ж, цяпер забывайся на бацьку, на матку — ідзі да мяне. Будзеш жыць у маім палацы за наймічку. А не захочаш — закіну і твой чэрап на свой дах.

Залілася Палашка слязьмі, ды што зробіш. Не злітуецца паганы Цмок.

Тым часам Палашчыны браты і праўда знайшлі ў аднаго багатага чалавека добрую работу. Згадзіліся рабіць на сваім хлебе. Тыдзень працавалі, а потым бачаць, усе харчы выйшлі. Чакалі, чакалі сястру — ды так і не дачакаліся.

Прыходзяць браты дахаты і з крыўдай пытаюцца ў бацькі:

— Чаму ты нам, бацька, не прыслаў харчоў?

— Як не прыслаў? — дзівіцца бацька. — Палашка ж панесла вам і хлеб, і да хлеба...

— Не, — кажуць браты, — не бачылі мы яе.

Напалохаліся бацькі, бядуюць: „Ці не загінула дзе дачка?"

— Я пайду яе шукаць, — кажа старэйшы брат.

— Ідзі, сынок, — згадзіліся бацька і маці.

Сабраўся ён і пайшоў. Ідзе так пушчай-лесам, бачыць — саломінкі зусім у другі бок павялі. Пайшоў ён па той сцежачцы, куды саломінкі вялі і прыйшоў да касцянога палаца.

Убачыла яго Палашка з акна, выбегла насустрач.

— Ах, братка, ах, родны! — плача сястра. — Няшчасная я цяпер гаротніца ды нявольніца...

І расказала яна брату, як у няволю да паганага Цмока трапіла.

(працяг будзе)

Польска-беларуская крыжаванка № 29

Запоўніце клеткі беларускімі словамі.



Адказ на крыжаванку н-р 25: Год, ода, дуброва, шанц, быт, смак, усё. Мост, род, душ, бабка, жорны, доступ, кава, мёд.

У маім сэрцы поўна мараў...

Зараз завіруем у танцы...

Прыйшоў час развітацца перад канікуламі з садком нумар 14. Каму да верасня, каму — назаўсёды... Вядома, і радасць, і сум у вачах. Асабліва матулі хвалююцца. І з польскіх аддзелаў, і беларускіх. Сёння дзеткі, што ходзяць у „нулявы" клас, падрыхтавалі для ўсіх прадстаўленне. Ага, спачатку трэба пачакаць, пакуль пані дырэктар з усімі развітаецца, пажадае прыемных канікул



Аграмадны аловак пані дырэктар „пасуе" Касю Жамойду на вучнёўскі шлях.

ды ўсяго найлепшага на новай дарозе, а пасля дзеці, апранутыя ў народнае адзенне будуць спяваць, танцаваць... Польская група сёння і кракавякі, і індзейцы... А беларускія („старшакі" і „нулёўка") — падляшскія беларусы. Спяваюць пра маму, танцуюць „бульбу" і іншыя танцы, паказваюць гульні коціка з лакомай мышкай, па-англійску лічаць... Усё трэба паказаць, каб тольки часу хапіла! Ды гледачы не томяцца, усё ім мала, і наперамен слухаюць, узіраюцца: раз польская група выступае, раз беларуская. А наканец — супольная песня, пра вандроўку па прыродзе. Беларускі тэкст перакладзены спецыяльна, а як добра гучыць: „У маім сэрцы толькі адзін свет: сонца, горы, поле, лес..." Часам крышку разыходзіцца з польскім арыгіналам, ды, здаецца, нават і лепш гучыць: „У горадзе мне жыць зацесна, паміж пылу і смуроду..." Яшчэ крышку, дык усе з'едзем з гэтага горада, з Беластока, які не такі яшчэ і брудны... Ужо чакаюць бабуліна вёска, цёплыя пляжы... Яшчэ толькі ўручаць нам дыпломы выпускнікоў і падарункі... А пані дырэктар „пасуе" нас на абітурыентаў...

Міра Лукша
Фота аўтара

Міхась Макарэвіч, Кася Бялькевіч, Ада Чабан, Юліта Яканюк, Кася Жамойда, Радзік Маціевіч і Маркела Сцепанюк з „нулявога" класа выступалі разам са „старшакамі".

Дзісна на старажытным шляху

Рака Заходняя Дзвіна.

— Чаму ў цэнтры Дзісны ўзарваны будынак? — папыталіся мы ў дзядзькі, які цікаўна сачыў за нашым паходам.

Праходзень наморшчыў бровы. Нашае пытанне здалося тут недарэчным. У адказ нашай наіўноце адрэзаў:

— Чаму? То ж... вайна была!

* * *

Панаваў сонечны поўдзень, калі пад'ехалі мы пад межы Дзісны. Уезд у мястэчка запыніў рамонт маста-манумента на рацэ Дзісне.

— Гожа як у Будапешце! — усклікнулі мы на прывітанне дзвюм вялікім, бурлівым рэкам — Дзвіне і Дзісне. Паміж імі, на высокім беразе роўнай вышыні, ля сутокаў, урэзалася рогам мястэчка Дзісна. Ідучы рамантаваным мостам у бок гістарычнага горада, мы прыгадвалі словы чужаземнага наглядальніка, які прыбыў у Дзісну 4 жніўня 1579 г., калі Стэфан Баторый, у прысутнасці сенатараў і войска, прыняў тут пакланенне Готгарда Кетлера, князя Курляндыі:

— Кароль на кані, праваруч Замойскага, стаіць на высокім узгорку. Конь пад ім высокі, цёмна-гнеды, турэцкай пароды. Баторый у пурпурным жупане, пад сабалёвай дэліяй. У правай руцэ дзяржыць кароткі, туркусамі набіты чакан. Далёкі голас труб апавяшчае пачатак парада. Блакітнае паветра працінае ўзмах залатой гетманскай булавы. На гэты жэст, у перспектыве гасцінца ўздымаецца хмара пылу, блізіцца і расце, коціць з сабой роў нібыта зрыў навальніцы. Некалькі дзесятак сажняў перад каралеўскім узгоркам блізіцца і мацуецца грымата, воблака разрываецца на дзве хмары, а там імчаць гусары, цяжкая конніца. Яны акутыя бляхай ад пят па галовы, у іх руках вялізныя дубцы, на якіх лунаюць палковыя харугвы (...). Далей лёгкая язда, казацкія аддзелы збройныя ў лукі, шаблі і спісы. Імчаць далей татарскія палкі на малых, хутканогіх конiках, з воўчымі і тыгровымі шкурамі на хрыбтах, на спінах ездакоў кажухі навыварат воўнай, што прыдаюць гэтаму войску выгляд асабліва дзікі, і заадно наводзяць захапленне чужаземцаў. І куды не глянь — усюды музыка, бо кожная харугва вядзе за сабой капелу (...).

Кароль, прыжмурыўшыся, глядзіць на парад сваіх сіл, што прыбылі сюды з Польшчы, Літвы, Лівоніі, Вугоршчыны і Нямеччыны, каб, як абвясціў сейму — заіржавеласць імя і славы Рэчы Паспалітай пачысціць, глянцу надаць.*

* * *

— Адшумела дзісненская слава! — гэта той першы сказ, які ўзнікне пасля сустрэчы з асалавелым мястэчкам. Дзе-нідзе толькі ацалелі даваенныя яўрэйскія камянічкі. У асноўным тут драўляныя хаткі з агародамі і гаспадарчымі забудовамі. На вузкіх брукаваных вулічках важна шпацыравала хатняе птаства: індыкі, гусі ды куры. Цяжэй было сустрэць чалавека... Так і дапляліся мы над бераг Дзвіны, адкуль добра відаць вялікі востраў Баторыя, дзе ў мінулым стаяў замак з 14 вежамі.

Вандруючы высокім берагам Заходняй Дзвіны, мы любаваліся краявідамі, стыхійнай прыгожасцю вірлівай, велічнай ракі (параўнанне з Дунаем у Будапешце вельмі дарэчы), якая на працягу звыш тысячакілематравай даўжыні (1020 км) з возера Каракіна на Валдайскім Узвышшы што ў паўночнай Расіі, праз усходне-паўночную Беларусь і ўсю Латвію (латвійская Даўгава) уплывае ў Рыжскі заліў Балтыйскага мора. На яе беразе нарадзіліся беларускія старажытныя гарады: Віцебск, Полацк, Дзісна. Дзісна, як раней згаданыя Дрысвяты і Браслаў, мела абарончае, памежнае значэнне.

* * *

Гісторыя мястэчка сягае старажытных часоў. У XI стагоддзі ўпамінаецца пад назвай Капец-Гарадок, як старажытнае паселішча Полацкай дзяржавы. Яго задачай была ахова воднага шляху па Дзвіне. Першае гарадзішча разбілася на правым баку Дзісны, дзе зараз востраў Баторыя.

Гісторыя Дзісны звязана з замкам, вядомым з XIV ст., які больш за сто гадоў выконваў ролю фарпоста Полацка на Заходняй Дзвіне. Пасля Грунвальдскай бітвы ў 1410 г. замак трациць стратэгічнае значэнне. Пасля Лівонскай вайны 1558-83 гг. прыйшоў у заняпад і ў 1654 г. быў здадзены маскоўскаму войску. Замак адноўлены ў 1655 г., адваяваны войскам ВКЛ пяць гадоў пазней. Канчатковы крах замка наступіць у час Паўночнай вайны.

Пра залаты век Дзісны, які звязаны з пабыўкай тут караля Баторыя, мы распавялі раней. Варта дадаць, што ў той час была перакапана канава дзеля спалучэння Дзісны і Дзвіны, у выніку чаго згаданы замак апынуўся на востраве. У 1559 г. Дзісна атрымала магдэбургскія правы. У той час існавалі ўжо дзве часткі горада: адна — вакол крэпасці, дзе знаходзіўся арсенал, рэзідэнцыя і гандлёвы пляц, другая — у сённяшнім месцы, дзе стаяла ратуша, рамесніцкія майстэрні, дзве праваслаўныя і адна уніяцкая цэрквы, пазней каталіцкі касцёл, якім апекаваліся езуіты з Полацка, а пасля свой касцёл і манастыр заводзяць францысканцы.

Заняпад пайшоў у канцы XIX ст., але яшчэ тады пражывала тут да сямі тысяч жыхароў, сярод якіх пераважалі яўрэі. У тым часе дзейнічалі некалькі сінагог, каталіцкі касцёл і шэсць праваслаўных цэркваў. Гістарычна-адміністрацыйнае значэнне, якое адыгрывала Дзісна з часоў ВКЛ, заняпала ў 1939 г., калі адсюль перанеслі сталіцу павета ў Глыбокае. З 1959 года Дзісна — у Мёрскім раёне.

* * *

Вандроўка старажытнымі вулачкамі Дзісны пакінула ашаламляючыя ўспаміны. З аднаго боку прыгнятаў нас млосны дых маразму і безнадзейнасці. Гістарычны рынак, дзе разбураны касцёл францысканцаў, парастае трава. Тут жа і срэбны Ленін, неяк ссутулены, з галавой абкаканай птушкамі. *Фэк-о!* — гэтак пра кашмарышча сказалі б у нашым Гарадку.

У час апошняй вайны ў Дзісне дзейнічаў лагер смерці. Загінула тут да пяці тысяч людзей, у большасці яўрэяў. У сённяшняй Дзісне — дзве з паловай тысячы жыхароў.

З другога боку — сутыкненне са слядамі старажытнай полацкай цывілізацыі прыносіла суцяшэнне. Яе крывіцка-балцкі характар адшукоўвалі мы ў рысах прахожых, назвах вёсак, азёр і ўрочышчаў. У стыхійных, суровых легендах. Наш шлях здобілі замкі-крэпасці (існуючыя як легенда) на вадзе — у Дрысвятах, Браславе, Дзісне...

Ганна Кандрацюк

Фота аўтара

* Цытата з даведніка Гжэгажа Ронкаўскага, які не адзначыў прозвішча чужаземнага аўтара.

Гістарычны рынак.



Від на востраў Баторыя.

Выбарчае лета

[**1** ☞ *працяг*]

Па жаданні цэнтральных улад СЛД на выбарчым спіску кандыдатаў на паслоў і сенатараў не будзе Яна Сычэўскага. Улады партыі прынялі такое рашэнне ведаючы, што могуць у Падляшскім ваяводстве страціць пару тысяч галасоў мясцовых лукашыстаў, а затым і адзін пасольскі мандат. Аднак левыя дэмакраты, якія цяпер атаясамліваюцца з НАТАўскай арыентацыяй, дайшлі, відаць, да вываду, што лепш мець аднаго пасла менш, чым дачакацца абвінавачванняў з боку саюзнікаў у тым, што трымаюць у сваіх радах адкрытых прыхільнікаў палітыкі Лукашэнкі. Ян Сычэўскі, які меў вялікі шанц стаць паслом на чарговыя чатыры гады, вымушаны цяпер змагацца за сенатарскі мандат як незалежны кандыдат. Зразумела, будзе ён мець поўную падтрымку падляшскай арганізацыі Саюза левых дэмакратаў, але стаць сенатарам галасамі толькі беларускага электарату немагчыма.

Выглядае на тое, што сёлетнія парламенцкія выбары адбудуцца без удзелу беларусаў як палітычнага суб'екта. Прысутнасць кандыдатаў беларускага паходжання на чужых спісках ніколі не мела вялікага грамадскага значэння. З другога боку беларускі электарат ніколі не давяраў сваім прадстаўнікам. Нават ва ўмовах дэмакратыі наш люд шукаў апекуноў сярод тых, якія прынамсі адкрыта не гаварылі пра сваё беларускае паходжанне.

Яўген Міранавіч

Прыйшлі з жыццёвымі крыжамі

Сёлета святкаванні на трэці дзень Тройцы ў Крыначцы былі вельмі ўрачыстымі. Каля царкоўкі ў Белавежскай пушчы, непадалёк Гайнаўкі, ужо напярэдадні святкаванняў сабралася вельмі многа вернікаў з розных куткоў Гайнаўшчыны. На ўсяночнае богаслужэнне, якое ўзначальвалі мітрапаліт Варшаўскі і ўсяе Польшчы Сава і епіскап Гайнаўскі Міран, прыбыло пешаходнае паломніцтва, арганізаванае Праваслаўным брацтвам св. св. Кірылы і Мяфодзія, якое дзейнічае пры Свята-Троіцкім саборы ў Гайнаўцы.

Вернікі выйшлі з сабора некалькі гадзін раней, пасля малебна. Па дарозе далучаліся да іх прыхаджане іншых гайнаўскіх парафій. Спераду з падменкай неслі вялікі драўляны крыж, ікону Святой Тройцы і харугвы, а за імі ішлі вернікі з іконкамі і спявалі царкоўныя песні.

— Драўляны крыж — сімвал веры і ўсіх жыццёвых крыжоў нашых вернікаў — тых, якія ішлі ў паломніцтве і тых, якія засталіся дома, — заявіў апякун Праваслаўнага брацтва св. Кірылы і Мяфодзія ў Гайнаўцы, пратаіерэй Славамір Хвойка.

— Усё наша жыццё з'яўляецца паломніцтвам, у час якога нясем свае крыжы. Наша пілігрымка несла крыж як ахвяру, дзякуючы Богу за шчаслівую дзейнасць нашага Брацтва. Вернікі маліліся за сваіх блізкіх і прасілі Бога дапамогі ў жыццёвых няшчасцях і патрэбах, — сказаў Юрый Радэцкі, член Управы Брацтва, які штогод арганізуе паломніцтва ў Крыначку.

У Крыначцы паломнікі пасля ўсяночнага богаслужэння ўкапалі крыж каля калодзежа з аздараўляльнай вадой, а пратаіерэй Васіль Шклярук, вікарны свяшчэннік Свята-Троіцкага сабора, асвяціў яго. Каля калодзежа шматлікія вернікі ўвесь час бралі ў бутэлькі і слоікі асвячоную ваду і абмывалі ёю твар і хворыя месцы. Вельмі хутка павялічвалася колькасць хустачак на плоце з калючага дроту. Людзі ставілі свечкі побач іконы Божай Маці, вынесенай з царквы, і заходзілі ў нядаўна збудаваную драўляную капліцу з нованапісанымі іконамі. Усё месца, дзе людзі здаўна атрымліваюць аблягчэнне ў духовых і цялесных хваробах, дакладна агароджанае калючым плотам, паколькі знаходзіцца яно на тэрыторыі вайсковай часці. Сярод вернікаў вядомы расказ пра чалавека, які ў час ваеннага становішча ўкрадкам прабіраўся праз высокія агароджы, каб набраць жыватворнай вады. Абмываў ёй свой хворы твар і атрымліваў аблягчэнне ў хваробе. Іншых хворых прывозілі на фурманках і некаторыя атрымлівалі аздараўленне. Раней вельмі многа людзей прыходзіла пяшком, ахвяроўваючыся такім чынам Богу. Яшчэ і зараз можна спаткаць вернікаў, якія адзінока або ў невялічкіх групах пешшу ідуць у Крыначку.

Аднак, выдатная большасць вернікаў, нават з недалёкай Гайнаўкі, прыязджае на машынах. Сёлета пашырылі даязную дарогу і падрыхтавалі стаянкі. Пасля богаслужэння ўвесь паток машын, на якіх вернікі вярталіся ў Гайнаўку, быў напраўлены на вёску Ліпіны, што дазволіла пазбегнуць коркаў на галоўнай даязной дарозе.

Многія вернікі, якія прыйшлі з паломніцтвам, засталіся ў Крыначцы на ўсю ноч. У час усяночнага богаслужэння ў пропаведзі ўладыка Сава адзначыў станоўчае значэнне Крыначкі ў жыцці мясцовых вернікаў і патрэбу духовага дасканалення людзей.

Пешаходнае паломніцтва са Свята-Троіцкага сабора ў Крыначку Праваслаўнае брацтва св. св. Кірылы і Мяфодзія арганізуе ўжо пяты раз.

— Першы раз у паломніцтве ўдзельнічала каля 50 асоб без свяшчэнніка. У мінулым годзе ішло 300 людзей, а ў гэтым годзе — 150 асоб. Сёлетняе паломніцтва лічу вельмі ўдалым, бо ўсю дарогу сярод ідучых адчуваліся малітвеннасць і духоўнасць, — заявіў Юрый Радэцкі.

Аляксей Мароз
Фота аўтара

Калісь лепш было

У вёску Тымянку з чыгуначнага прыпынку Новы Нурэц вядзе вымашчаная брукам шаша. Брук той роўненькі, без выбоін, відаць не падвяргаўся выпрабаванням цяжкімі нагрузкамі, ды і наогул, калі яны якія былі, дык нешматлікія, пра што сведчыць зелень прабіваючайся між камянёў расліннасці. Ды і пра самую вёску можна без залішняга перабольшання сказаць, што патанае ў расліннасці. Багата тут прысаддзя, якое аж выліваецца на вуліцу. Прахожы можа любавацца абсыпанымі чырвонымі пладамі вішнямі і чарэшнямі, прыгнёнымі ад ураджаю яблынямі і грушамі. Да таго ж водар ліпавага поўнаквецця ўводзіць у нейкае райскае захапленне.

Ці гэтаксама па-райскаму адчуваюць сябе жыхары вёскі, я не праводзіў вялікага апытання, бо гутарыў толькі з солтысам Анатолем Страпчуком, аднак думаю, што згодна вядомай прыказцы, што там добра, дзе нас няма, яны могуць не раздзяляць майго захаплення іхняй вёскай. З аднаго боку таго згаданага зеленаватага бруку красаваліся палоскі жыта, аўса і бульбы, але з другога боку красаваўся нестары аблог. У мінулым годзе на яго месцы нехта пасеяў грэчку, але засуха не дазволіла выспець плёну і так засталося.

Тыя, што яшчэ вымушаны гаспадарыць, робяць гэта так, як і іх даволі адлеглыя продкі, сеючы і садзячы наперамен жыта, авёс і бульбу. Гаспадароў у вёсцы нямнога, усяго дванаццаць. Маюць яны дзесяць трактароў, дзесяць коней і восем легкавушак. Дзве асобы працуюць па-за вёскаю, палова дарослых працаздольных — беспрацоўныя. У вёсцы жыве дзесяць бабылёў і трое дашкольнікаў. Пачатковую школу ў Сямі-хочах наведвае васьмёра дзяцей, а гімназію ў Нурцы-Станцыі — трое. Амаль усе хаты заселены; пустуе толькі адна.

Зараз пасля ўваходу ў вёску кідаецца ў вочы запушчаны людзьмі будынак, у які намагаецца пасяліцца расліннасць. Гэта будынак колішняй агранамоўкі, бо пяцьдзесят гадоў назад было вырашана, каб у кожнай вёсцы быў аграном. Калі жыццё не апраўдала тых буйных планаў і аграном стаў вёсцы непатрэбным, у агранамоўку пасялялі прыезджых калгасных чыноўнікаў. Бо ў Тымянцы, бадай у 1949 годзе, узнік калгас. Дажыў ён паўкруглага юбілею і ў мінулым годзе спыніў дзейнасць. Калгаснікі былі разводзілі кароў, бугаёў, свіней, авечак. У апошнія гады, калі не аплачвалася гадоўля жывёлы, калгас сеяў збожжа, але выручкі ад яго не хапіла нават на аплату падаткаў.

Крыжы на канцы Тымянкі.

Калгас спыніў дзейнасць і здавалася б, што цяпер былыя калгаснікі павінны ўзяць справу ў свае рукі. Аднак гэта справа даволі складаная, бо не могуць яны забраць сваёй зямлі, унесенай у калгас імі або іх продкамі. За выдзяленне тае калісь уласнае зямлі землямеры загнулі такую цану, што не па кішэні яна яе саўладальнікам; танней купіць чужую зямлю з Агенцтва сельскагаспадарчай уласнасці, чым вярнуць патомную сваю... Добра хаця, што ўсе жывуць у сваіх хатах, бо калгасных неяк не далі рады пабудаваць. А ўжо былі калісь прывезлі шэсць складаных дамоў, каб сабраць на месцы, але на гэта не хапіла ўжо грошай і так тыя дамы прадалі.

Калгас быў абрабляў і агенцыйнае поле, але адмовіўся ад яго. А за тое выдзяленне ўласнага поля калгаснікам хоча заплаціць нейкі бізнесмен узамен за бясплатную аддачу яму калгасных будынкаў разам з пляцамі пад імі. Быў ён там раз і ад таго часу больш не паказаўся ў вёсцы.

У Тымянцы працуюць дзве прыватныя крамы і адна гэсаўская. Аб'язныя крамы перасталі прыязджаць, бо ніхто не хоча ў іх купляць. Ездзяць „рускія", па 20-30 самаходаў у суткі. У іх вяскоўцы купляюць за дзве трэці афіцыйнай цаны паліва, папяросы, гарэлку, адзенне, абутак. У вёсцы калісь ГРН была, школа, доктар, бібліятэка, а цяпер усё прападае. Зарастаюць зеленню брамы з вуліц на панадворкі, вёска зліваецца з акружаючай прыродай...

— Калісьні час лепшы быў за цяперашні, — канстатуе солтыс Анатоль Страпчук.

Аляксандр Вярбіцкі
Фота аўтара

Святкаванні ў саборы

24 чэрвеня ў Свята-Троіцкім саборы ў Гайнаўцы чарговы раз праходзілі святкаванні ў гонар усіх святых Зямлі Беларускай. Пасля Літургіі, якую ўзначаліў настаяцель прыхода, мітрафорны пратаіерэй Міхаіл Негярэвіч, адслужаны быў малебен усім беларускім святым, у час якога гайнавяне маліліся да сваіх нябесных заступнікаў, просячы хадайніцтва ў Бога сваім блізкім, усім гайнаўскім прыхаджанам і ўсім праваслаўным вернікам. У пропаведзі а. Міхаіл Негярэвіч звярнуў увагу на вялікае значэнне святых Зямлі Беларускай для гайнавян па прычыне прысвячэння ім бакавой царквы. Асобнай павагай сярод гайнаўскай моладзі карыстаецца мучанік дзіцятка Гаўрыіл. Ягоная ікона ляжыць пасярэдзіне згаданай царквы і гайнавяне могуць прыкладацца да яе штодзень, а кожную другую пятніцу служацца акафісты мучаніку Гаўрыілу — заступніку дзяцей і моладзі. У пропаведзі а. Міхаіл звяртаў таксама ўвагу на прападобнамучаніка Афанасія Брэсцкага і на нядаўна праслаўленых новамучанікаў, адклікаўся да жыцій беларускіх святых — Еўфрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага.

(ам-з)

Вайсковыя прыходы

12 ліпеня Праваслаўная царква ўшаноўвае памяць слаўных і ўсяхвальных першавярхоўных апосталаў Пятра і Паўла, якія больш за ўсіх шчыравалі ў пропаведзях веры Хрыстовай. За гэта ў час праўлення рымскага імператара Нерана апостал Пётр быў распяты, а апостал Павел — абезгалоўлены.

Апосталы Пётр і Павел з'яўляюцца нябеснымі заступнікамі вайсковага прыхода ў Беластоку. 12 ліпеня г.г. у царкве св. Марыі Магдаліны, якая выконвае таксама ролю гарнізоннага храма, Бажэственную Літургію для афіцэраў і салдат узначаліў праваслаўны ардынарый Войска Польскага, генерал брыгады, епіскап Міран.

Апрача Беластока вайсковыя прыходы знаходзяцца яшчэ ў пяці гарадах: у Варшаве — св. Мікалая, Гданьску — св. Юрыя, Вроцлаве — Уздзвіжання Крыжа Гасподняга, Цехацінку — св. Міхала і Пярэмышлі — Прасвятой Дзевы Марыі. Гданьскі вайсковы прыход мае сваю інтэрнэтавую старонку — www.republika.pl/arekzi.

У Войску Польскім душпастырскую паслугу нясуць шэсць праваслаўных дэканаў — у Шлёнскім і Паморскім ваенных акругах, у сухапутных войсках, ваенным флоце, паветрана-танкавым корпусе ды ў авіяцыі і паветранай абароне.

Ад страху сонца не бачылі

Успаміны Івана АРТЫШУКА з Курашава, народжанага 5 студзеня 1913 года.



У нашай вёсцы да бежанства жыло 180 гаспадароў. Перад фронтам страшылі, што немцы будуць скуру дзерці з людзей, дык большасць выехала. І як рускія адступалі, то ўсе пагрузіліся на вазы з дзеравянымі коламі, з будамі, абвешанымі плахтамі. Адны бліжэй заехалі, іншыя аж пад японскай граніцай апынуліся. Але дванаццаць сем'яў асталося; яны сваякамі былі. У Нараўцы тысячы цераз мост перабіраліся і калі немцы наблізіліся, той мост узарвалі. І мая сям'я была ў ліку тых дванаццаці. Тыя, што асталіся, ад страху сонца не бачылі. Давай вяртацца. Пад Свінароямі шасцярых нямецкіх салдат вярхом едуць — смерць! Адна баба сама была ўпала перад немцам і паказвае, што шыю будуць адрэзваць. Старшы немец злез з каня, падняў яе за руку і сказаў:

— Нэй, матка! Нах хаўзэ.

Прыехалі ў Вераб'і, а там ні духа, адно каты і сабакі. Там нашы пераначавалі і ў Курашава. Мой тата на фронце папаў у аўстрыйскі палон і дома былі дзед, баба, мама і радня.

У Курашаве, у школе і лепшых хатах, пасяліліся нямецкія гаспадары і тыя дванаццаць нашых, што асталіся, два дні рабілі немцам, а адзін сабе. Немцы старэйшыя былі, змабілізаваныя, без сем'яў. Усё, што бежанцы ў полі пакінулі, немцы скарысталі — яравое, бульбу і жывёлу. Немцы не знуткаваліся, а за працу плацілі. На нашым месцы жыў сяржант, насіў ён шлем з пігай. Дома ў яго асталася жонка і двое дзяцей. Ён мяне вельмі любіў, на руках насіў. Калі вяртаўся ад сям'і, прывозіў мне мармелад; вельмі смачны быў, бо ў нас ні цукру, ні солі не было. Немцы выязджалі на самаходах. Мне вельмі цікава было пабачыць, як яны так без каня едуць. Самаходы іхнія без кузава былі, адно шыба спераду ад ветру і камароў.

Да вайны пушча была такая, што сонца не відаць было. А ў 1914 годзе ў Гайнаўцы была толькі адна вуліца — сённяшняя Ліповая. Немцы пабачылі багацце пушчы і ў Гайнаўцы пабудавалі хімічны завод і тартак. І па цэлай пушчы вузкакалейкі праклалі для машынак. Для працы ў Гайнаўку прыязджалі католікі з-за Браньска, бо нашы ў бежанстве былі. Цягнуліся яны сюды і тут жылі ў зямлянках. А ўсе тыя, што асталіся ў вёсках, у лесе сядзелі — так дрэвы рэзалі. І пасля вайны рубалі яны пушчу, бо трэба было аддаць крэдыт, што Пілсудскі ўзяў.

Нашы людзі вярталіся з бежанства, хто як мог вырвацца. Хто прыехаў у дзевятнаццатым, хто ў дваццаць першым годзе. У Курашаве ўсе хаты асталіся. Людзі вярталіся на свае гаспадаркі, у пустыя хаты, у лахманах. Падшпаркаў за дзесяць гадоў за Браньск вазілі, за пастухоў; яны там за лета зарабляліе адзенне і цялятка — так дабытак разводзіўся. Зямлі не хапала, бо работы не было і ўсе ў вёсцы сядзелі; былі такія панадворкі, на якіх гаспадарыла чатырох гаспадароў. Не было ніякага заробку, хіба што малаціць або жаць сярпом ці бульбу матычкаю капаць.

Хаты малыя былі, адзін пакой у хаце быў з малым акенцам, каб цяплей было і менш дроў расходаваць. Стаяла адна печ, у якой жар у купку зграбалі і трымалі, бо запалак не было. Пры хаце быў хлеў, то пасля туды дзверы прарэзалі і каморку рабілі, у якой таксама стаўлялі печку. Дровы вазілі з Белавежскай пушчы, з паломаў. Уставалі а другай гадзіне на досвітку і ехалі ў Свінароі.

З ільняной пражы бабы сарачкі іголкай шылі. Краўцы шылі нагавіцы або летнікі, але такім летнікам карысталіся да смерці. У царкву бабы ў адной вышыванай сарочцы хадзілі, а пасля вопратку можна было ў жыдоў купіць.

Чобаты рабілі шаўцы, пераважна жыды ў гарадах; і ў Курашаве адзін быў. У Гайнаўцы рабілі чосанкі (валёнкі) з воўны. З Кляшчэль прывозілі галёшы. Хадзілі і ў пасталах, зробленых з гумы з дзіркай спераду і ззаду, каб вада выцякала.

Майстры ўсялякія былі: шавец, краўцы, кавалі, цесляры. Былі не толькі ў Курашаве, але і ў Койлах, Лушчах і Камені.

Трымалі авечак і шылі кажухі — была гэта найтаннейшая вопратка. Кушнеры былі ў Локніцы і Лушчах; пуд жыта за шкуру бралі. Да кажуха непатрэбныя былі ні вата, ні подбіўка. Кажухі насілі не толькі зімою, але і летам вечарам апраналі.

У Курашаве два пагоны дабытку выводзілі, а свіней адзін пагон. Усіх свіней да Пятра ў поле выганялі, а пасля кармілі пад Руздво. Летам не калолі, бо мяса тады псавалася.

Поле раздробленае было да 1934 года, калі зрабілі камасацыю. І калі пад жыта трэба было араць, то меральі поле, каб адзін другому не пераараў. Пакуль калёніяў не было, поле дзялілі пад ярыну, азіміну і параніну. На апошняй паслі кароў і свіней, але і там аралі і баранавалі, то і малака мала было, а ім многа сілкаваліся. У 1934 годзе не стала паранінаў, бо сталі ўсё абсейваць. І на сваёй калёніі кожны ніжэйшае пад пашу пакінуў.

У 1921 годзе настаўнікам у курашаўскай школе стаў Міхал Давідзюк з Наройкаў. Я яму літр малака насіў, у сумцы разам з кніжкамі. Ён у пакоіку спаў на ложку з дошак, у ложку салома была плахтай засланая. Пасля далі яшчэ польскую настаўніцу Ірэну і яны двое вучылі. Потым яны пажаніліся. Былі ў іх два сыны Мірэк і Славік. Мірэк у вайну папаў у Англію, а Славік жыў у Беластоку. Настаўнік прыгожы голас меў і ў царкве спяваў. Калі чытаў Апостала, то аж газнік дрыжаў. І дзяцей сваіх у царкву вадзіў.

У школе вучылі чытаць, пісаць, рахункаў, гісторыі ад 900 года, геаграфіі, гімнастыкі, спеву, малюнкаў і рэлігіі. Да школы мяне мама рускай азбукі навучыла і цяпер я Псалтыр умею па-славянску чытаць.

Споведзь агульную школьнікам бацюшка ў суботу адпраўляў, а прычашчаў у нядзелю; як у войску. Калі я ў 1935-36 гадах у войску ў Седльцах служыў, то бацюшка быў капітанам. У мундзіры хадзіў, салютаваў, а калі прыходзіў у царкву, скідаў мундзір і апранаў аблачэнне. У войску розніцы між праваслаўнымі і католікамі не было. У царкву толькі да споведзі хадзілі. Ішлі з аркестрам. Царква ў вялікай хаце была. Па нядзелях у касцёл хадзілі. Хто не ішоў у касцёл, той чытаў або так сабе сядзеў. А я любіў у касцёл хадзіць, касцельная служба мне больш падабалася ад нашай.

У 1939 годзе бацюшка памаліўся перад крыжамі на абодвух канцах вёскі, ішоў вуліцай і свянціў з вуліцы панадворкі. З'явіліся немцы. Яны нешта паміж сабою перагаварылі і паехалі. А пасля ўжо бацюшка гаварыў нам, што мо таму вёсцы ў вайну нічога не сталася. І немцы, як адступалі, не спыняліся ў Курашаве.

Запісаў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Жыццё маё працай праляцела

(заканчэнне; пачатак у № 27)

Успаміны Ніны ПАНАСЮК са Старога Беразова.

Надышоў дзень, калі нашы немцы закруціліся быццам у мышалоўцы, апошні раз наладзілі павозкі і пачалі ўцякаць. Нам загадалі забіраць кароў і ехаць за імі, а самі пагналіся з усіх канскіх сіл. Нас няма каму падганяць, едзем мы невядома куды. Па дарозе заехалі да маёй сяброўкі, а яе няма; відаць ейныя гаспадары яшчэ раней ад нашых паўцякалі.

Кароў гналі мы дзесяць кіламетраў. Натрапілі на домік недалёка дарогі. Заехалі на панадворак, каб адпачыць, а там поўна нямецкіх салдатаў. Забралі яны ад нас фурманку і рванулі наперад колькі сіл у коней было. Мы пакінулі кароў і пайшлі ў напрамку лесу. Прайшлі з пяць кіламетраў і натрапілі на хутар. Там мы спыніліся і сталі гаспадарыць. Усім стала весела, што надышоў канец нашай няволі. Быў з намі музыка, які іграў на губным гармоніку мелодыю „В саду иль в огороде", а мы, хто толькі змог, танцавалі. Там некаторыя папараваліся і пачалі жыць сямейна.

Аднак з галавы не выходзіла думка: „А што далей? Немцаў няма, паўцякалі, хто нас тут знойдзе?" Доўга, аднак, не чакалі. Бадай на другі дзень надышлі салдаты з зорачкамі на шапках і з вінтоўкамі гатовымі да стрэлу. Прывіталі нас словамі:

— Продажная шкура! Фашистам служили, предатели родины!

Усе мы прыціхлі. Маўчалі, не ведалі, што гаварыць. Хтосьці азваўся:

— Сілай нас сюды прывезлі.

— Молчать! — прасіпеў, відаць, афіцэр.

Загадаў ён нам збіраць навакольных кароў і гнаць *на родину*, а калі б хто пытаў, адказваць, што Баранаў так загадаў. Мы так і зрабілі, а калі ад іх адышлі, усё пакінулі. Патрэбныя нам тыя каровы! Абы далей ад немцаў і бліжэй роднай хаты.

Кіраваліся ў напрамку Беластока. Ішлі па снезе. Абутак мелі не найлепшы, але холаду не адчувалі. Грэла нас думка, што з кожным крокам набліжаемся да роднай хаты. Спыніліся ў хатцы, што ў лесе стаяла, на адпачынак. Спалілі там усе дакументы — а цяпер іх патрабуюць! Ногі так нам памерзлі, што з ботаў не выцягнуць. Так я свае ногі змарнавала.

Па дарозе сустрэлі рускіх салдат, якія на радзіму гналі кароў; ім таксама нейкі Баранаў загадаў. Супольна дайшлі да ракі і там разышліся з імі. Мост быў узарваны, а каровы па лёдзе не пайшлі і салдаты пагналі іх уздоўж рэчкі. А мы па лёдзе перайшлі на другі бераг.

Так мы дайшлі ў Беласток. Там я адлучылася ад групы і асталася адна. Даведалася, які цягнік у Бельск едзе. Паціхеньку, каб ніхто не ўгледзеў, забралася ў каровячы вагон, прысела ў куточку быццам мыш і так даехала ў Бельск. З Бельска дзядзька завёз мяне ў суседнюю вёску Збуч, а адтуль дабралася пехатою ў роднае Старое Беразова. Не ведаю, прыйшла я ці прыляцела — ногі самыя неслі. Было 4 лютага 1945 года.

Вёска жыла яшчэ фронтам, які тут пракаціўся. Толькі немцы, як сюды заглянулі, не мелі ўжо часу мыцца і адпачываць. Яны назад гналіся яшчэ хутчэй, як сюды — рускія ім на пяты наступалі. Многія вяскоўцы з радасцю прыгадвалі, як раней прарочылі немцам капут.

Каго я дома пакінула, таго і застала, толькі бацькі ў брата жылі; ён сабе хату купіў і бацькоў да сябе забраў. Аднак брат мой Васіль з сям'ёй у Расію падаўся, каб яшчэ там гора скаштаваць. Многія тады паверылі, што там дадуць ім гаспадаркі і дамы, і паехалі. Агітатар у нас быў, які гаварыў:

— Поезжайте в Россию, каждому дом под жестью дадим.

Швагер мой спытаў яго:

— А дзе ж вы іх маеце? Цікава, што за столькі гадоў вайны дамы ў вас засталіся...

Агітатар раззлаваўся, абзываў швагра ворагам і падрыўніком, хацеў яго прыкончыць. Калі б не народ, швагра не было б у жывых.

У 1948 годзе я выйшла замуж; не аглянулася, як і калі. Ці з кахання ўсё гэта было? А хто тады аб гэтым думаў?! Каханне забрала вайна. Пайшла за таго, які трапіўся. І далей працавала, колькі сілы было.

Пачалі будавацца, з цэглы, бо такая мода пайшла. Самыя адны будаваліся, усё гэтыя мае рукі рабілі; вапну насілі, цэглу і цэмент. Адкуль сілы ў мяне браліся, сама не ведаю; мо з таго, што ўсё рабілі сабе. Дзівуюся нават, што ўсё гэта мы самі змаглі зрабіць.

Пасля дзеці пайшлі; траіх сыноў і дачку выгадавала. А цяпер адна асталася ў пакойчыку, нікому непатрэбная. А каму ж патрэбны стары чалавек, брыдкі, на сябе не падобны, і гаворыць не так; адны недастаткі ў старэйшых людзей.

Сыны пажаніліся і пайшлі сваімі дарогамі. З мужам не жыву, ён у горад да сына падаўся. Адзін сын са мною жыве; ён жыцця як след не ўладзіў. Жонка адышла ад яго і ён сам дзяцей гадаваў. Пайшлі яны ўжо ў свет, але да яго прыязджаюць, і да мяне заглянуць. І столькі пацехі ў мяне.

З кожным годам старэю. Ногі баляць, хадзіць не хочуць ужо. Вочы глядзяць, а бачыць не бачаць. Кругом надыходзіць бяда. На дадатак і дзеткі забываюць мяне. А каму патрэбная старая маці, якая амаль аджыла ўжо сваё жыццё?! Асталіся на старасць адны праблемы і непацешная бяда.

Так маё жыццё і праляцела. Больш гора і нядолі чым дабра ў ім было. Аднаго толькі ў Бога прашу: каб не даў мне залегчы ў пасцель, а дазволіў дачакаць скону на нагах.

Запісаў Грыша МАРОЗ

Старое Беразова, красавік 2001 года.

Праблемы лакальнай прэсы

16 чэрвеня г.г. у Доме культуры „Захэнта” ў Беластоку праходзіў I Падляшскі сеймік лакальнай прэсы, спалучаны з выстаўкай „Прэса малых айчынаў”. Мерапрыемства арганізаваў штомесячнік „Весці пястоўскія” пад патранатам старшыні Сейміка Падляшскага ваяводства, прэзідэнта Беластока, фонду IDEE і радыё „Плюс”.

У сустрэчы ўдзельнічалі больш пяцідзесяці галоўных рэдактараў і выдаўцоў. Прысутнічалі парламентарыі, прадстаўнікі гарадской адміністрацыі, свету культуры і бізнесу.

У дакладах, як і ў час дыскусіі ставіліся фінансавыя праблемы лакальных мас-медыяў, задачы незалежнай прэсы ў будаванні мясцовай грамадскасці і супрацоўніцтве з самаўрадамі. Прыслухоўваючыся дыскусіі, не цяжка было прыйсці да высновы, што праблемай з’яўляецца скарачэнне колькасці чытачоў і ў выніку нізкі продаж выданняў.

— Зараз чалавек задумоўваецца, — гаварыў удзельнік дыскусіі, — на што выдаць грошы: купіць газету ці булачку? Рашыўся на булачку, значыцца, грамадскасць становіцца бяднейшай.

На стан фінансаў лакальнай прэсы адмоўна паўплывала ўвядзенне 22% падатку ПДВ ад друкарскіх паслуг і 7% ад продажу. У гэтай справе пасол Кшыштаф Юргель паслаў прэм’р-міністру інтэрпеляцыю ў справе ўвядзення „нулявой” стаўкі ПДВ ад тавараў і паслуг.

Падаваліся спосабы павялічання тыражу.

— Мы, напрыклад, — гаварыў чарговы прамоўца — адмовіліся ад традыцыйнага продажу свайго часопіса ў кіёсках. Карыстаемся ўласнымі прадаўцамі. Справа настолькі карыснейшая, што адначасна атрымоўваем інфармацыю не толькі наконт распаўсюджвання, але і таго, што аб газеце думаюць чытачы, што іх цікавіць і г.д. Прадавец становіцца заадно анкецёрам.

Старшыня Падляшскага клуба бізнесу прапанаваў больш пісаць аб гаспадарцы, інтэграцыі з Еўрасаюзам і ахове асяроддзя. „Гэта невычэрпная крыніца тэм для публіцыстаў. На тым можна зрабіць нядрэнны бізнес”, — заахвочваў Станіслаў Ракіцкі.

У далейшым ходзе дыскусіі гаварылася аб прафесіянальнасці журналістаў, спосабах правільнага перадавання інфармацыі грамадскасці, як стаць незалежнымі мас-медыямі і вызваліцца з-пад уплываў мясцовых самаўрадаў.

— Паколькі будзем пісаць пад дыктоўку войтаў і бурмістраў, — гаварылі прамоўцы, — ніколі не справімся з гэтай праблемай.

Сенатар Ян Хайноўскі сказаў такое:

— Журналісты больш павінны займацца гаспадарчымі справамі. Паказваць добрыя прыклады, а не рабіць сенсацыю з таго, каму нага падвінецца...

Калі слухаў я выступленняў прамоўцаў і гартаў артыкулы журналістаў змешчаны ў бюлетэне „Kraina Lokalności”, выдадзенай фондам IDEE, усё больш разумеў праблемы лакальнай прэсы і чамусьці параўноўваў іх з праблемамі „Нівы”. Гэта ж і „Ніву” пачалі менш чытаць. Чаму ж бы не пакарыстацца прыкладам іншых і не ўзяцца за распаўсюджванне тыднёвіка „сваімі” людзьмі. Лічу, што „Ніва” мае шмат сімпатыкаў, якія маглі б дапамагчы ў так важнай для нас, беларусаў, справе.

Уладзімір Сідарук

Выкарыстоўваючы адкіды



Робаты з пластмасавых адкідаў.

У Гарадской бібліятэцы ў Гайнаўцы працуе выстаўка мастацкіх прац вучняў мясцовай Падставовай школы н-р 5. Працы былі выкананы з пластмасавых адкідаў.

Ужо чацвёрты год вучні ПШ н-р 5, з дапамогай настаўніцы Альжбеты Хмялеўскай, выконваюць працы з адкідаў і тройчы паспяхова прымалі ўдзел у Агульнапольскім конкурсе паўторнага выкарыстання адкідаў.

— Вучні выконваюць працы самастойна, паводле сваіх праектаў. Я толькі падказваю ім як рэалізаваць іх задумы, звяртаючы ўвагу на тэхнічныя аднетнасці, — заявіла Альжбета Хмялеўская. — Свае працы вучні выконваюць пасля заняткаў.

21 красавіка г.г. з нагоды „Дня зямлі” ў Падставовай школе н-р 5 праходзіла мерапрыемства „Адкрытыя дзверы”, у час якога школу наведалі сябры вучняў і бацькі. Наведвальнікі маглі галасаваць на самую цікавую для іх працу, выкананую з пластмасавых рэштак. Найбольш асоб прагаласавала за работы Рафала Есялоўскага і Агнешкі Маркевіч. Сярод 46 прац узнагароджаных было 20. Аўтары самых лепшых прац атрымалі ў Гарадской бібліятэцы ўзнагароды бурмістра Гайнаўкі.

— Рафал Есялоўскі выканаў працу, прымяняючы пластмасавыя бутэлькі з наклейкамі, а Агнешка Маркевіч з бутэлек і шруб зрабіла робата-даму, — сказала Альжбета Хмялеўская. — Выкарыстанне адкідаў вучыць дзяцей і моладзь інакш глядзець на свет. Трэба вучыць моладзь сартаваць адкіды па спецыяльных умяшчальніках, якія павінны стаяць ва ўсім горадзе, і адпаведна іх выкарыстоўваць.

Аляксей Мароз
Фота аўтара

Сіпко

У міжваенны час жыў у Дубічах-Царкоўных прымак Сіпко. Аднойчы, у сенакос, скідаў ён у клуні сена з фуры на сторану, а ягоны цесць Сахарко прымаў віламі тое сена, высока, аж каля самых ентак. Там нязручна было і стары пакаўзнуўся ў сене і паляцеў уніз. Сіпко машынальна наставіў уверх вілы і шчасце, што Сахарко толькі лёгка абдзёр скуру і не настраміўся на настаўленыя зубы, а ўпаў на фуру, на якой яшчэ было сена. Калі ўстаў на ногі, дык некалькі разоў заехаў зяця ў гомель за тое, што выставіў вілы, калі стары ляцеў уніз.

Ёсць пагаворка, што ніхто горш не зробіць, як чалавек самому сабе. Аднойчы на Пакрову Сіпко каля царквы ў п’яным відзе перакуліў ларок аднаму гандляру з Бельска-Падляшскага. На зямлю пасыпаліся цукеркі, забаўкі і іншая дробязь. Гандляр глянуў з нянавісцю на Сіпка і прашыпеў праз зубы: „Zapamiętasz ty mnie, chamie!”

Аднойчы Сіпко выбраўся фураю ў Бельск і калі даехаў пад сам горад, там каля моста чакалі яго некалькіх здаравенных бамбізаў. Было яшчэ цёмна, яны сцягнулі яго з воза і адбілі яму, як у нас кажуць, хрыпы. Пачаў чалавек на вачах сохнуць і скора памёр ад сухотаў.

Калі б ён такую дурнату ўчыніў сваім людзям, яны б яго аблаялі і больш нічога не ўчынілі б дрэннага. Але ён трапіў на мсцівага чалавека, а такі горшы ад чумы. Сіпко гэтага не прадбачыў і без пары адышоў на той свет.

Мікалай Панфілюк

Чорная карціна шаленства

Шаленства — хвароба, якая выклікае страх, а нават псіхоз у грамадстве. І няма чаму здзіўляцца, паколькі магчымасць заражэння гэтай хваробай, асабліва ў вясковай тэрыторыі, даволі простая.

У мінулым годзе ў Бельскім павеце ў заражэнні вірусам шаленства падазраваліся 14 асоб (у 1999 г. толькі 4 асобы). З гэтага ліку 8 асоб мелі кантакт з хворымі каровамі, па 2 асобы — з янотамі і сабакамі і па адной — з лісам і катом. Усе падазроныя атрымалі ўколы супраць шаленства.

Паводле павятовага санітарнага інспектара Магдаліны Ляшчынскай, вялікай праблемай з’яўляюцца бяздомныя сабакі. У мінулым годзе зафіксавана было 80 выпадкаў пакусання людзей сабакамі. Бельская санэпідэмстанцыя ў гэтай дзялянцы супрацоўнічае з ветэрынарнай службай, якая на працягу 10 дзён вядзе нагляд за сабакамі і аб выніках паведамляе санэпідэмстанцыю.

На тэрыторыі Бельскага павета ветэрынарны нагляд летась выявіў шаленства ў 23 дзікіх лісоў, 4 янотаў, 3 кароў і тхара. Паводле павятовага ветурача Богдана Заваліха, шаленства сярод дзікіх жывёл — вынік адсутнасці прывівак супраць гэтай хваробы ва ўсходняй частцы краіны, а таксама брак попыту на лісіныя шкуры. Рост папуляцыі лісоў, якія з’яўляюцца галоўным фактарам распаўсюджвання шаленства, пагражае заражэннем хваробай хатняй жывёлы. Аб прафілактычных прывіўках павінны памятаць уладальнікі катоў і сабак (у нас прышчэпліваецца 70% сабак і зусім мала катоў).

Хаця існуе законны абавязак прышчэплівання сабак і катоў супраць шаленства, частка ўладальнікаў ухіляецца ад гэтага абавязку. Пакуль не будзе сістэмы рэгістрацыі і ідэнтыфікацыі хатняй жывёлы, цяжка будзе яго выканаць.

Міхал Мінцэвіч

Запрашэнне на „Купалінку”

21 ліпеня г.г. у Арэшкаве-Парыеве 139, 148 адбудзецца мерапрыемства пад назвай „Купалінка”.

У праграме:

6^{00} — 15^{00} — Спаборніцтвы вудзільшчыкаў за прыз Залатой рыбкі.

16^{00} — 20^{00} — II Агратурыстычны чэмпіянат свету ў кіданні абцугамі. Падкоўванне каня. Кавальскі канцэрт.

20^{00} — Агляд гармонікаў і баянаў.

Арганізатары падрыхтуюць удзельнікам мерапрыемства пачастунак — бігас. На месцы працаваць будзе буфет. Для ўдзельнікаў спаборніцтваў і агляду прадугледжаны ўзнагароды. Больш дэталёвыя інфармацыі можна атрымаць па тэлефоне: (0-85) 873-31-79, сотавы: 0-604-995-421. **Ірэна і Зіновій Галёнкі**

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Міхновіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 85) 743 50 22.
Internet: http://www.kurier-poranny.com/niwa
E-mail: niwa@kurier-poranny.com

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury i Dziedzictwa Narodowego.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп’ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk”, ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2001 r. upływa 5 września 2001 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2001 r. wynosi 19,50 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 84,00; pocztą lotniczą Europa — 96,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 120,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Towarowa 28, 00-958 Warszawa. Nr konta PBK S.A. XIII Oddział Warszawa 11101053-16551-2700-1-67.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 2,80 zł, a kwartalnie — 36,40 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,10 (kwartalnie — 53,30), pocztą lotniczą: Europa — 4,70 (61,10), Ameryka Płn., Afryka — 5,30 (68,90), Ameryka Płd., Środk., Azja — 5,90 (76,70), Australia — 7,70 (100,00). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Ніўка

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

„Даўціпы” Андрэя Гаўрылюка

У рэнтгенаўскі кабінет заходзіць Смерць і пытае:

— Ці маеце нейкія новыя слайды для мяне?

* * *

Урачы пры ложку хворага ў бальніцы:

— Гэта будзе тыф, — кажа адзін.

— Не, гэта напэўна халера, — кажа другі.

— Ідзем у кафейную, — кажа трэці. — Анатаміраванне пакажа, хто з вас меў рацыю.

* * *

— Пан доктар, ці гэта небяспечная аперацыя? — пытае хворы.

— Так, на пяць аперыраваных чатырох памірае. Але не турбуйцеся — у мінулым тыдні я правёў чатыры аперацыі і ўсе аперыраваныя не жывуць.

* * *

Пасля прыбыцця на неба нябожчык няспынна рагоча. Заінтрыгаваны святы Пётр пытае пра прычыну такіх паводзін.

— Бо, уявіце сабе, там унізе мяне ўсё аперыруюць.

* * *

У псіхушцы лекар чуе, што ў адной зале нехта голасна лічыць: дваццаць тры, дваццаць тры, дваццаць тры... Зацікаўлены заглядае праз дзірку ад ключа і ў той жа момант з дзіркі высоўваецца іголка. Лекар адскоквае, трымаючыся за вока. За дзвярамі чуваць лічэнне: дваццаць чатыры, дваццаць чатыры, дваццаць чатыры...

* * *

Знерваваны Грыша жаліцца сябру:

— Калі сустрэну таго лайдака Пецьку, выб'ю яму ўсе зубы! Не, адзін яму пакіну.

— Чаму?

— Каб ведаў, што гэта такое зубны боль.

Крыжаванка



Гарызантальна: 2. край зямлі над вадаёмам, 4. агульны нечаканы спалох, паніка, 6. яўрэйскае свята, у часе якога вернікі жылі ў шалашах, 7. забруджанае месца, 9. усходні ўладар, 11. чалавек з незвычайным талентам, 12. манархічная дзяржава з імператарам, 13. частка драматычнага твора, 15. насякомае, якое стракоча крыламі, 17. прастора для заняцця, 18. Францішак, паэт і асветнік, які жыў у Хорашаўшчыне ў Свіслацкім раёне (1741-1825), 19. ласо.

Вертыкальна: 1. травяністая расліна з пякучымі лісцем і сцяблом, 2. круглая мяккая шапачка без казырка, 3. бег каня наўскач, 4. прыхільнік, 5. прозвішча аўтара кнігі „І так бывала”, 6. Змяіная рака, якая бярэ пачатак у Йелаустонскім нацыянальным парку, 8. чорна-шызая ядомая ягада, падобная на маліну, 9. жоўта-чырвоная фарба для фарбавання валасоў, 10. металічны стрыжань, болт, 14. індыйскі ўладар з I і II ст. н.э., заснавальнік кушскай дынастыі, 16. горад на ўсходзе Албаніі, 17. устойлівы сезонны вецер з мора на сушу летам і з сушы на мора зімою.

(Ш)

Рашэнне крыжаванкі складуць літары з пазначаных курсівам палёў. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку з 23 нумара

Гарызантальна: Рыбера, Ларнака, Нэруда, Віцьбіч, абарог, нагляд, Рагачоў, Плеяды, сюрпрыз, акраса.

Вертыкальна: плывун, працяг, Замбія, ранча, Бурса, радно, Богарт, Рычард, Гаўдзі, аблік, ліяна, Дрыса.

Рашэнне: **У дурнога салаўя дурная і песня**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Вользе Дземяновіч** з Варшавы.

Аб'явы

Sprzedam łóżko solarium z nowymi lampami — 3 500 zł. Tel. (+48 85) 740 10 80; (+48) 601 827 819.

О-то-то слоўнік

Басовішча

Слова *Басовішча* зьявілася ці то пад канец 1989, ці то на пачатку 1990 году, калі беларускія студэнты высьпельвалі ідэю фэстывалю беларускай рок-музыкі ў Гарадку пад Беластокам. Гісторыя неяк не занатавала, хто першы прапанаваў такі назоў. Але, без сумневу, можна сьцьвярджаць, што слова прынялося на Беласточчыне адразу. Яно было растыражавана бадай ці не трыма тысячамі плякатаў з анонсам першага фэстывалю ў ліпені 1990-га. А пасьля гэтай імпрэзы стала вядомае і ў Беларусі.

Этымалёгія слова даволі простая — гэта абрэвіятура *БАС* (Беларускае Аб'яднаньне Студэнтаў, арганізатар фэстывалю) плюс салідны беларускі канчатак *-овішча*. Нехта потым спрабаваў зьвязаць паходжаньне слова з *бас-гітарай* — маўляў, на фэстывалі моцна *басуюць*, то бок граюць на *басе*, інакш, *бас-гітары* — але студэнцкі *БАС* адкінуў гэткую „народную этымалёгію” як прынцыпова няслушную. Затое студэнтам спадабаўся калямбур пісьменьніка Ўладзімера Арлова, які, пабачыўшы бурную рэакцыю гарадоцкай публікі на выступы беларускіх „цяжказбройных” гуртоў „Мроя” і „Ўліс”, ахрысьціў фэстываль *Бясовішчам*.

Басовішча было словам зусім новым, бо прэзэнтавала зусім новую зьяву — беларускую рок-культуру, пазбаўленую савецкага штампу і расейскамоўнай афарбоўкі. Гэта была першая культурная зьява, у якой і дзякуючы якой беластоцкія маладыя беларусы знайшлі поўнае духоўнае паразуменьне з падпостсавецкімі суродзічамі. А таксама адчулі гонар за беларускую культуру перад маладымі палякамі, якія, пачынаючы зь першага фэстывалю, нязьменна складалі сама менш палову публікі ў гарадоцкім лесе, дзе йшлі канцэрты.

Бадай ці паўторыцца яшчэ дзе-небудзь такое, як у Гарадку, калі сотні маладых галасоў сьпявалі разам з Касяй Камоцкай, Сержуком Сокалавым-Воюшам, Віктарам Шалкевічам песьні пра Беларусь. А таксама пра „Радыё Свабода” з гуртам „Уліс”...

Ян МАКСІМЮК

(Паводле часопіса «ARCHE», 7/2000)

„Павандаліць” у Барыку...

Ці стары, ці малады з гмінаў Беласточчыны
Ва ўрочышча Барык прэцца на „Басовішча”.
І з сусвету ўсяго, не толькі з Еўропы
У гміну Гарадок вядуць нашы тропы.
Ці з музыкай за пан брат, ці глухі ад роду,
Для кампаніі нам усім едзем з асалодай.
Хто нап'ецца славы там, а хто проста піва,
(Я, стары Вандаліска, ўпіцца не лянівы!),
Хто махае там сцягом, хто трусамі з майкай,
Хто раве на поўны рок, хто — пад балалайку
(У кустах расселася цэлая радзіна!),
Кайфам наліваецца не адна хвіліна.
Посьлей ждаць нам трэба будзе рок такога року.
А мне дзеўку каб злавіць, прытуліць у змроку!

Вандал АРЛЯНСКІ

Пятніца 20.07.2001 г.

		17^{00}	Пачатак
17^{05}	—	17^{40}	Пастскрыптум
			Конкурсная частка
17^{40}	—	18^{00}	Бяз Назвы (Бяроза)
18^{00}	—	18^{20}	Голая Манашка (Менск)
18^{20}	—	18^{40}	Сходы (Міхалова)
18^{40}	—	19^{00}	Галіна Бязу (Менск)
19^{00}	—	19^{20}	Happy Face (Маладэчна)
19^{20}	—	19^{40}	Aquamorta (Менск)
19^{40}	—	20^{00}	Цмокі (Менск)
20^{00}	—	20^{20}	c.r.a.k. (Міхалова)
20^{20}	—	20^{40}	Зьніч (Менск)
20^{40}	—	21^{00}	Бан Жвірба (Гомель)
21^{00}	—	21^{20}	Праект 2001 (Гарадок, Гайнаўка, Бельск-Падляскі, Беласток)
21^{20}	—	21^{40}	Імпэт (Менск)
21^{40}	—	22^{00}	Tabolich & Splenetic (Менск)
22^{00}	—	22^{20}	0-85 (Беласток)
			Канцэрт мінулагодніх пераможцаў і гасьцей
22^{20}	—	22^{50}	The Dvery (Польшча)
22^{50}	—	23^{30}	Epicentre (Англія)
23^{30}	—	00^{20}	Сонца Мао (Беларусь)
00^{20}	—	01^{00}	Зэт (Беларусь)

Субота 21.07.2001 г.

		18^{00}	Аб'яўленьне вынікаў конкурсу
18^{05}	—	19^{00}	Выступ пераможцаў
			Канцэрт зорак
19^{00}	—	19^{50}	Палац (Беларусь)
19^{50}	—	20^{40}	Крама (Беларусь)
20^{40}	—	21^{30}	Meyze (Англія)
21^{30}	—	22^{20}	Rima (Польшча)
22^{20}	—	01^{10}	Pidżama Porno (Польшча)
01^{10}	—	02^{10}	N.R.M. (Беларусь)